Рабочыя і работніцы! Працоўныя гораду і вёскі!

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניגט אייך
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І СЯВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
29 жніўня 1931 г.
№ 199 (3288)

УЗЬНІМАЙЦЕСЯ УСЕ, ЯК АДЗІН, НА ПАДТРЫМАНЬНЕ, НА АБАРОНУ ВАШЫХ ПАЛОННЫХ БРАТОЎ, ЯКІХ СЬЦІСКАЕ КРЫВАВАЯ РУКА ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ!

Выканаць фінансавы плян трэцяга кварталу

Фінансавы плян трэцяга кварталу
даючага году пяцігодкі знаходзіц
пад яўнай пагрозай недавыканань
На 20-га жніўня, г. зн. за 5 дэкад
выканалі ўсяго толькі 33,9 проц.
ну. У фінансавым пляне стварыўся
ны прарыў—мы не дабралі 8 млн.
б.

Значэньне гэтага факту эробіцца
бліва ясным, калі мы ўлічым, што
нансавы плян 3-га кварталу зьяўля
ца важнейшым зьвяном, ад якога
лежыць выкананьне ўсяго кварталь
га народна-гаспадарчага пляну. Не
каканьне фінансавага пляну азна
е, што пад пагрозу пастаўлена вы
нэньне важнейшых гаспадарчых за
. Невыкананьне фінансавага пляну,
забясьпечвае бурныя тэмпы разь
цьця сацыялістычнай індустрыі, са
лістычнай рэканструкцыі сельскай
падаркі і культурнага будаўніцтва,
ачае новыя дадатковыя труднасьці
шляху нашага прасоўваньня напе
д. Вось чаму трэба згрупаваць ува
ўсёй савецкай грамадзкасьці на не
ходнасьці ў найкарацейшы тэрмін
відаваць прарыў і забясьпечыць
ўнае выкананьне пляну мабілізацыі
одкаў.

Як стварыўся недабор у 8 млн.
б.? Каб адказаць на гэтае пытань
, трэба ведаць што ў 3-м квартале
коўнымі відамі плацяжоў зьяўляюц
сельгаспадатак і страхоўка, пая
я накапленьні спажыўкаапэрацыі,
зыка і ўклады ў ашчадкасы.

ПА СЕЛЬГАСПАДАТКУ мы выка
лі ўсяго 12 проц. гадавога пляну і
проц. квартальнага пляну. Най
льш паказальным і характэрным
я палітычнай ацэнкі становішча на
тым вучастку фінансавага пляну,
жа служыць той факт, што кулац
а ўнесла ўсяго толькі 11 проц. нале
чных з яго плацяжоў. Сельгаспада
к бягучага году зьяўляецца магут
м сродкам далейшага разгортваньн
барацьбы за суцэльную калектыві
цыю і ліквідацыю на гэтай аснове
лацтва як клясы. Толькі права-апар
ністычным нежаданьнем разгортваць
ступ на кулака, нежаданьням націс
ць на яго з усёй сілай можна тлу
чыць тое, што кулацкі сабатаж у
ногіх выпадках застаецца беспака
ным, што на барацьбу з гэтым caба
жам не мабілізуюцца масы калгась
каў і бядняцка-серадняцкага сялян
ства.

Недапушчальна павольнымі тэмпамі
ае збор сельгаспадатку і страхоўкі
калгасным сэктары сельскай гаспа
даркі, ня гледзячы на найвялікшыя
ільготы, якія ў гэтым годзе закон
прадстаўляе калгасьнікам. У чым жа
тут справа? Справа тут у апартуні
стычнай стаўцы на самацёк, у адсут
насьці шырокай палітычнай масавай
работы, у недазнэнцы фінансавага
пляну з боку раду партыйных і савец
кіх арганізацый.

ПА ПАЯНАКАПЛЕНЬНІ ў спажы
вецкай кааперацыі, асабліва на вёсцы
мы ганебна адстаем. Замест бальша
віцкай барацьбы за мабілізацыю паёў,
за мабілізацыю сродкаў пайнікаў, ка
апэрацыя будуе сваю работу, спадзя
ючыся на дзяржаўны крэдыт. Ня леп
стаіць справа і з рэалізацыяй акцый
Трактарацэнтру і абавязацельстваў на
сельгасмашыны.

ПРАРЫЎ ПА ПАЗЫЦЫ зьяўляецца
асабліва недапушчальным. На самай
справе, трэба ўспомніць, з якім вялі
зарным энтузіязмам рабочая кляса,
калгасьнікі і бядняцка-серадняцкае ся
лянства адгукнуліся на новы выпуск
пазыкі. Нам удалося ў выключна ка
роткія тэрміны перавыканаць плян рэа
лізацыі пазыкі сярод рабочых, слу
жачых і калгасьнікаў. Аднак, замацаваць
гэтыя посьпехі і іх пашырыць
змаглі далёка ня ўсе.

Афармленьне падпіскі, уплата пер
шага ўзносу і ахоп новых рабочых
пазыкай яшчэ адстаюць. Вось краса
моўныя факты: на заводзе імя Вара
нцылава падпіскай на пазыку не ахоп
лена 320, на фабрыцы «Камунарка»—
413, на заводзе «Бальшавік»—160, на
абутковай фабрыцы—353, на швэйнай
фабрыцы «Акцябр»—483 чал. Значыц
ца па 5 толькі менскіх прадпрыем
ствах падпіскай не ахоплена больш
паўтары тысячы рабочых. Гэты факт
красамоўна сьведчыць аб тым, што ў
справе разгортваньня далейшай пад
піскі на пазыку перад намі багатае
поле дзейнасьці.

З другога боку, вялізарную работу
трэба разгарнуць на вёсцы. Асноўная
ўвага павінна быць аддана ліквідацыі
прарыву ў рэалізацыі пазыкі ў адна
асобным сэктары вёскі, 13,9 проц. вы
каканьня пляну—гэтая лічба сьведка
таго, што ў рэалізацыі пазыкі сярод
аднаасобнікаў ня было ўдарных тэм
паў, што на гэты адказнейшы вуча
сток не было зьвернута дастаткова
ўвагі. Разам з тым трэба сказаць, што
ня гледзячы на перавыкананьне кан
трольнага заданьня па рэалізацыі па
зыкі калгасным сялянствам, мы маем
вялікія магчымасьці пашырыць наш
посьпех і на гэтым вучастку. Такі
факт, што са 160 калгасаў Быхаўска
га раёну толькі 54 ахоплены падпіс
кай—гэты факт павінен прымусіць
прызадумацца фінансавы апарат і калг
асную сыстэму.

Гаворачы аб нашых задачах у ба
рацьбе за пазыку, нельга абыйсьці
моўчкі маючыяся факты незаконнага
затрыманьня кіраўнікамі ўстаноў і
прадпрыемстваў у сваіх касах першага
ўзносу па пазыцы «3-ці рашаючы год
пяцігодкі». Так напрыклад, адміністра
цыя абутковай фабрыкі першы ўзнос
рабочых утрымала, але ў касу ашчад
насьці не ўнесла. Тое-ж самае зрабіла
і кантора В.Э.О. Мы расцэньваем гэ
тыя факты, як злачыннае парушэньне
савецкіх законаў і патрабуем шпар
кага і суровага суда над вінаватымі.

Дзе корані прарыву ў выкананьні
фінансавага пляну 3-га кварталу?
Яны—ў апартуністычнай практыцы фі
нансавых апаратаў, у палітычнай блі
зарукасьці з боку раду партыйных і
савецкіх арганізацый. Сэмай яскра
вай ілюстрацыяй можа служыць Бы
хаўскі раён. Ня гледзячы на тое, што
раён за невыкананьне фінансавага пля
ну аказаўся на чорнай дошцы, ня гле
дзячы на тое, што раён ня выходзіў
з паласы фінансавых прарываў, фі
нансавы апарат у гэты адказны мо
мант быў... у водпуску. Не выпадкова
таму ў Быхаўскім раёне мы замест
прыліву ўкладаў у касы ашчаднасьці
маем адлiў, замест 100 проц. выка
нальня абавязковых плацяжоў маем
5,6 проц. і 4,7 проц. выкананьня квар
тальнага пляну паянакапленьняў спа
жыўкаапэрацый. З правай практыкай
мірна ўжываюцца і факты «левацкіх»
загібаў. Так, у тым жа Быхаўскім ра
ёне Ніжне-Тошчыцкі сельскі савет даў
кожнаму сялянскаму двару цьвёрдыя
заданьні па рэалізацыі пазыкі, пагра
жаючы, у выпадку невыкананьня гэ
тых заданьняў, штрафам.

Праваапартуністычная практыка ў
барацьбе за фінплян і «левацкія» за
гібы, парушэньне лініі партыі ў галі
не фінансавай палітыкі—вось перша
прычыны прарыву.

Да канца кварталу засталося трохі
больш 3-х дэкад. У гэты кароткі тэр
мін трэба дабіцца кругога пералому
на фінансавым вучастку. Фінансавы
плян павінен быць выкананы. Фінан
савая база пад плян 3-га рашаючага го
ду пяцігодкі павінна быць падведзена,
і яна будзе падведзена ў жорсткай
барацьбе за бальшавіцкія тэмпы мабі
лізацыі сродкаў, супроць правых і
«левых» апартуністаў, на аснове генэ
ральнай лініі нашай ленінскай партыі.

Адозва Выканкому МОПР'у

Выканком МОПР'у зьвярнуўся да працоўных усіх краін з адозвай, у якой гаворыць:

«З па-за кратаў турмаў фашысцкай Польшчы, дзе пакутуе больш 10 тысяч палітзьняволеных, з турмаў Фінляндыі, Латвіі, Літвы, і Эстоніі, з засьценкаў італьянскага фашысцкага пекла, з краін фашызуючайся «дэмакратыі» даносяцца да нас водгукі гераічнай і цяжкай барацьбы палонных рэволюцыйных барацьбітоў супроць ўзмацняючагася прыгнечаньня турэмшчыкаў.

У Польшчы паводле загаду ўраду Пілсудзкага палітзьняволеныя пераводзяцца на становішча крымінальных злачынцаў.

У Латвіі ўведзены новы крымінальны кодэкс, у многа раз больш жорсткі, чымся дзейнічаючыя там дагэтуль законы рускага царызму. У Фінляндыі застаўшыхся ад тэрору фашысцкіх банд рэвалюцыйных рабочых трымаюць на становішчы бандытаў і рабаўнікоў. У Італіі адзін за адным гінуць у вільготных казаматах лепшыя прадстаўнікі пралетарыяту.

Гэта пагоршаньне турмовага рэжыму, гэты новы дзівосны паход буржуазіі супроць пралетарскіх барацьбітоў, гэтая ўзмоцніўшаяся вакханалія турмовых распраў зьяўляецца простым адбіцьцём палітыкі тэрору фашызуючайся ва ўсім сьвеце буржуазіі.

Гэта—адзін з мэтадаў прыдушэньня нарастаючай рэвалюцыйнай хвалі, прыдушэньня магутна ўздымаючагася контрнаступленьня шырокіх пралетарскіх і працоўных мас супроць спробаў капіталізму ўскласьці на іх цяжкасьці крызісу. Гэта—адно з зьвеньнеў падрыхтоўкі вайны і інтэрвэнцыі. Гэта—частка пляну па зьнішчэньні найбольш стойкіх, авангардных байцоў чырвонага фронту, аказаўшага супраціўленьне крывяжэрным ваенным задумам імпэрыялістаў.

Рабочыя і работніцы! Беспрацоўныя! Працоўныя гораду і вёскі! Узьнімайцеся ўсе як адзін, на падтрыманьне, на абарону вашых палонных братоў!

Баявымі дэманстрацыямі і стачкамі пратэсту выступайце супроць белага тэрору, клясавых судовых распраў капіталістычных судоў, супроць зьверскага зьнішчальнага рэжыму у турмах».

ПРАЛЕТАРЫІ БЭРЛІНУ!

Пратэстуйце супроць нячуваных зьдзекаў польскага фашызму над палітвязьнямі

Адозва рабочых, работніц і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу Менскай абутковай фабрыкі

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ

З-за турэмных сьцен польскай дыфэнзывы, з-за межы так званай «дэмакратычнай рэспублікі» пана Пілсудзкага даносяцца да нас стогны ахвяр фашысцкага тэрору нашых братоў па клясе, якія пакутуюць у руках азьвярэлых катаў.

Дзясяткі тысяч лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы, працоўнага сялянства Польшчы пакутуюць у засьценках польскага фашызму, церпяць нечалавечыя мукі, пераносяць зьверскія зьдзекі.

Востры эканамічны крызіс ва ўмовах развалу прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, які ўсе разгортваецца, ва ўмовах павялічэньня беспрацоўя—прымушае польскі фашызм шукаць выхад у падрыхтоўцы да наладу на Савецкі Саюз, у зьверскіх гвалтах над гераічнымі барацьбітамі, над лепшымі пралетарамі.

Нашы перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, нашы посьпехі ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі ў чатыры гады, калектывізацыя сельскае гаспадаркі і ліквідацыя на яе аснове кулацтва, як клясы, выклікае шалёную нянавісьць да Савецкага Саюзу капіталістаў усяго сьвету, асабліва з боку польскіх фашыстаў, лёкаёў францускага капіталу.

Будуючы і пускаючы ў ход новыя фабрыкі і заводы, электрастанцыі, пускаючы на калгасныя палі тысячы трактароў, лепшыя матар'яльныя і культурныя ўмовы рабочых і калгасьнікаў, пераможна завяршаючы пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі—рабочыя Савецкага Саюзу сваім прыкладам заражаюць рабочых і сялян капіталістычных краін.

Пралетары Бэрліну. Выходзьце на вуліцу, пратэстуйце супроць нячуваных зьдзекаў польскага фашызму, патрабуйце спыненьня гэтых зьдзекаў.

Мы спадзяемся, што вы ня будзеце ў баку, што вы аказаце дапамогу польскаму пралетарыяту, што вы прыкладзеце ўсе сілы для абароны Савецкага Саюзу — сацыялістычнай бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту.

Мы, калектыў рабочых абутковай фабрыкі з абурэньнем выказваем свой пратэст і, у адзнаку салідарнасьці, бярэм на сябе наступныя абавязацельствы: перабудаваць работу ячэйкі МОПР'у, арганізаваўшы агульнафабрычную ячэйку і арганізаваць ячэйкі ў кожнай групе і па цэхах; правесьці вучот усіх членаў МОПР'у на фабрыцы і ліквідаваць запазычанасьць па членскіх узносах; разгарнуць культмасавую работу па групах па выпіскі мопраўскай літаратуры; кантрольную лічбу ў 750 рублёў у дапамогу палітвязьням павялічыць сустрэчнай лічбай да 1.000 руб.

Бэрлінскія абутнікі, мы чакаем і ад вас актыўнага ўдзелу ў дапамозе палітвязьням у Польшчы.

Няхай жыве інтэрнацыянальная салідарнасьць пралетарыяту ўсіх краін!

Няхай жывуць нашы браты палітвязьні!

Няхай жывуць працоўныя Нямеччыны!

РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ.

Інтэрв'ю польскага пасланьніка ў СССР

ВАРШАВА, 25-VIII. «Газэта Польска» публікуе гутарку з польскім пасланьнікам у СССР панам Патэкам наступнага зьместу: «У Варшаве я сустрэў вялікую зацікаўленасьць фактам уручэньня мною савецкай ўладзе дагавору аб ненападзе.

Па сутнасьці дагавор гэты сам па сабе не гаворыць нічога новага. Перамовы, адносна пакта, пачаліся яшчэ ў 1926 г. Я пераняў іх у 1927 г. і з цягам часу ўручыў савецкаму боку сьпіс пунктаў, адносна якіх паміж бакамі ня было дасягнута згоды. Пункты гэтыя да гэтага часу не ўрэгуляваны. Апроч таго як пакт Келёга, так і пратакол Літвінава, а таксама часовае напружаньне сітуацыі адсоўвалі на пэўны час гэтыя пытаньні. Мушу аднак пад крэсьліць, што яны ніколі ня былі застаўлены, і зараз я ўнёс наш праект, каб паскорыць цяг пачатай дыскусіі».

Магутнай хваляй пратэстаў, гневу і абурэньня кіпяць мільёны працоўных

Кожны дзень у рэдакцыю паступаюць з усіх канцоў Савецкай Беларусі пратэсты супроць крывавай расправы польскіх катаў-фашыстаў над палітзьняволенымі белай Польшчы. Рабочыя, калгасьнікі зьбіраюць вялікія сумы на карысьць палітзьняволеных зварачваюцца да пралетарыяў і працоўных мас усіх капіталістычных краін узьняць свой магутны голас пратэсту супроць разгулу фашысцкага тэрору ў Польшчы, на Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

— Рабочыя Гомельскага чыгуначнага вузла рашуча пратэстуюць супроць зьверскіх катаваньняў рабочых і сялян у Польшчы, на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. У рэзалюцыі рабочыя патрабуюць спынення катаваньняў і выносяць канкрэтныя пастановы аб дапамозе братам па клясе.

Рабочыя майстэрняў шляху зьвярнуліся да ўсіх пісьменьнікаў, мастакоў і вучоных Беларусі узьняць свой голас пратэсту супроць зьверстваў, якія творацца ў панска-фашысцкай Польшчы.

Рабочыя дыстанцыі моцных токаў адлічваюць 30 проц. свайго дзённага заработку ў фонд матар'яльнай дапамогі палітзьняволеным капіталістычных краін.

2.000 рабочых гомельскіх дэпо спэцыяльным лістом зьвярнуліся да ўсіх рабочых і працоўных сялян фашысцкай Польшчы ў якім яны пратэстуюць супроць зьверскіх катаваньняў і заклікаюць іх распаўсюджваць вучэньне Леніна, бо толькі нізрынуцьцё ўлады фашызму пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дасьць вызваленьне пралетарыяту. Рабочыя дэпо адлічваюць 15 проц. свайго дзённага заработку ў фонд дапамогі палітзьняволеным.

САВЕЦКА-ПОЛЬСКІЯ АДНОСІНЫ

ВАРШАВА, 25-VIII. Сёньня ва ўсіх газэтах надрукавана наступнае паведамленьне польскага тэлеграфнага агенцтва ПАТ. «У выніку абмену поглядаў, які праводзіцца з 1926 г., паміж польскім і савецкім урадамі па пытаньні аб дагаворы аб ненападзе польскі пасланьнік у Маскве пан Патэк уручыў 23 жніўня Народнаму Камісару замежных спраў польскі праект дагавору аб ненападзе. Праект гэты складзен стасоўна да ўмоў, створаных правядзеньнем у жыцьцё у 1929 годзе пакта Келёга». У палітычных колах афіцыйнае паведамленьне аб польскай прапанове зрабіла вялікае ўражаньне. Паведамленьне ПАТ было разаслана ўчора ўвечары. Польская прэса, аднак, устрымалася ад усякіх камэнтарыяў. Толькі «Наш пшэглёнд» вітае ініцыятыву Польшчы і падкрэсьлівае, што яна знаходзіцца ў цеснай сувязі з адбываючымися франка-савецкімі перамовамі.

ЗВОДКА

ўборкі лёну, яравых і сяўбы азімины па БССР (без саўгасаў).

На 25 жніўня 1931 г.

Назва раёнаў	Убрана лёну ў проц.	Убрана ярыны ў проц.	Засеяна азімины ў проц.
Паўднёвая			
Брагінскі	100	59,1	—
Буда-Кашалеўскі	100	82,7	—
Бабруйскі	81,5	85,6	13,1
Веткаўскі	100	63,2	—
Глускі	78,6	74,8	—
Гомельскі	53,0	71,2	—
Жыткавіцкі	54,8	30,4	—
Жлобінскі	100,0	77,9	—
Кармянскі	89,0	66,0	0,5
Камарынскі	81,0	49,6	—
Ельскі	100	72,3	1,2
Лоеўскі	100	61,9	0,4
Любаньскі	95,9	87,3	—
Лельчыцкі	100	49,0	—
Мазырскі	97,5	66,1	—
Нараўлянскі	80,8	61,2	—
Парыцкі	100	100	—
Петрыкаўскі	99,8	62,9	—
Рагачэўскі	92,7	83,5	—
Рэчыцкі	100	89,8	—
Слуцкі	71,5	73,6	0,1
Старобінскі	98,7	78,3	—
Стара-Дароскі	80,4	60,5	—
Тураўскі	69,5	45,9	0,6
Церахаўскі	100	80,6	0,1
Чачэрскі	100	45,3	—
Чырв. Польскі	100	92,8	—
Чырв. Слабодзкі	49,6	46,0	—
Уваравіцкі	100	81,0	1,2
Хойніцкі	100	56,5	—
Усяго па паўднёвай зоне	93,3	72,0	0,8
Цэнтральная			
Асіпавіцкі	87,4	75,9	—
Быхаўскі	57,6	83,3	0,2
Барысаўскі	35,2	24,4	5,6
Балынецкі	74,6	62,5	—
Бягомельскі	3,9	32,4	0,8
Бярэзінскі	100	85,0	—
Горацкі	52,9	53,8	0,5
Заслаўскі	35,2	35,2	0,1
Клімавіцкі	98,5	63,8	2,1
Крупскі	62,1	62,0	—
Капыльскі	46,5	73,4	—
Касьцюковіцкі	55,5	45,8	0,1
Клічаўскі	100	63,9	—
Койданаўскі	36,2	52,8	0,7
Крычаўскі	87,3	72,3	—
Лагойскі	76,1	47,1	0,3
Магілеўскі	75,2	37,6	—
Мсьціслаўскі	43,7	27,4	1,1
Менскі	13,9	21,8	—
Прапойскі	97,0	71,4	—
Пухавіцкі	79,3	61,0	—
Плешчаніцкі	8,7	22,8	—
Смалявіцкі	88,7	62,2	1,9
Талачынскі	73,5	48,6	0,5
Чэрвенскі	87,8	48,8	—
Чавускі	85,6	69,6	0,2
Чэрыкаўскі	73,4	59,5	0,3
Шклоўскі	92,3	58,2	0,3
Узьдзенскі	76,5	63,3	—
Усяго па цэнтральнай	64,9	53,6	0,5
Паўночная			
Асьвейскі	22,3	2,3	—
Аршанскі	61,1	40,5	4,3
Бешанковіцкі	23,8	36,2	—
Віцебскі	29,2	40,4	—
Вушацкі	67,3	25,0	—
Гарадоцкі	69,1	52,1	27,2
Дубровенскі	78,9	48,1	5,1
Дрысенскі	32,8	7,2	0,1
Лёзьнянскі	87,5	49,6	10,0
Лепельскі	68,3	23,2	—
Полацкі	29,2	17,9	—
Расонскі	73,0	18,6	51,5
Сураскі	81,8	72,5	23,7
Сенненскі	56,6	64,0	—
Сіроцінскі	54,8	48,4	—
Чашніцкі	49,6	11,3	—
Усяго па паўночнай	60,7	37,2	7,7
Па БССР	69,2	56,3	2,1

Біцца за своячасовы засеў азімага кліну

Сустрэчнымі плянамі, высокімі паказьнікамі нормы выпрацоўкі на асновах зьдзельшчыны ўшчыльніць тэрмін асеньняй сяўбы

Пастанова

Калегіі Народнага Камісарыяту Земляробства і Праўленьня Калгасцэнтру БССР

1. Прызнаць ход уборкі яравых, зяр
зёвых, лёну, сіласаваньня кармоў, пра
вядзеньня асеньняй сяўбы і падняць
ня зябу абсалютна нездавальняючым.
Асабліва адставаньне наглядаецца ў
абмалоце, мочцы і расьцілцы лёну,
абмалоце азімых для пасеваў і ўсё
яшчэ не пастаўлена ў цэнтры ўвагі
пытаньне сіласаваньня кармоў.

2. Адзначыць недапушчальна слабую
барацьбу з боку Райза і Райкалгас
саюзаў за практычнае ажыцьцяўлень
не ў саўгасах і калгасах зьдзельшчы
ны, вынікам чаго зьяўляецца нездаваль
няючы ход уборачнай, пасеўнай
і зяблевай кампаній.

3. Указаць на абсалютна нядбайныя
адносіны з боку зямельных і калгас
ных арганізацый да пытаньня давя
дзеньня пляну другога ўкосу да саў
гасаў і калгасаў, што зьяўляецца вы
нікам апартуністычнай недаацэнкі
стварэньня сталай кармавой базы для
соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

4. Адзначыць, што з боку дырэктар
оў МТС, саўгасаў і кіраўнікоў калгас
аў абсалютна ня прыняты меры па
поўным скарыстаньні уборачных і ма
лацільных машын, якія ёсьць у саўга
сах, МТС і калгасах.

5. Адзначыць невыкананьне дырэк
тывы ЦК і СНК аб вырабе ільнамалі
цілкі «Эдзі» Сампрамсаюзам, Бел
сельгаснабам і Калгассаюзам.

Выходзячы з гэтага, Калегія Народ
нага Камісарыяту Земляробства адзна
чае:

1. Абавязаць Райза, Райкалгассаю
зы у яшчэ большай меры сканцэнтра
ваць увагу на пасьлядоўнай барацьбе
за ўборку яравых, збожжавых, за лік
відацыю адставаньня паміж цераблень
нем, абмалотам, мочкай і расьцілам
лёну, за абмалотам азімых збожжавых
для асеньняй сяўбы, сіласаваньня кар
моў, а таксама правядзеньня зяблева
га ворыва і падрыхтоўкі да расста
ноўкі сіл па ўборцы гародзіны і буль
бы.

2. Абавязаць саўгастрэсты і Трак
тарацэнтр прыняць усе меры да мак
сымальнай загрузкі с. г. машын як
для ўборкі так і для абмалоту азі
мых і сіласаваньня кармоў.

3. Для высьвятленьня прычын дрэн
нага скарыстаньня ільнацерабілак у
асобных саўгасах і МТС, камандыра
ваць у аснoўныя ільняводныя раёны
і саўгасы спэцыялістаў з наступных
устаноў: з Інстытуту Мэханізацыі—1
чалавек, Наркамзему—1. Трактарацэн
тру—1, Калгасцэнтру—1, Белсельгас
снабу—1, Ільнянай станцыі—1.

Раёны ўстанавіць т.т. Сьмірнову і Кіпенварліцу.

4. Для ўзмацненьня ўборкі яравых, абмалоту азімых асеньняй сяўбы, сіласаваньня кармоў і разгортваньня зяблевага ворыва, прасіць ЦК і СНК пасла ць у раёны найбольшага адставаньня па правядзеньні важнейшых с.-г. кампаній кіруючых цэнтральных работнікаў.

5. Адзначаючы, што з боку Райза і Райкалгассаюзаў ня прынята ніякіх мер да арганізацыі ўзаемнай насеннай дапамогі, пацярпеўшым ад стыхійных бядот, абавязаць Райза і Райкалгассаюзы забясьпечыць неадкладнае выкананьне дэрэктывы аб стварэньні насенных і страхавых фондаў, а таксама аб аказаньні ўзаемнай насеннай дапамогі, не чакаючы водпуску насеннай ссуды.

6. Для ўзмацненьня аказаньня ўзаемнай дапамогі па правядзеньні ўборкі асеньняй сяўбы, абмену лепшым вопытам, абавязаць Райза і Райкалгассаюзы арганізаваць пасылку брыгад у колькасьці 2.000 чалавек.

Сэктару арганізацыі працы Наркамзему і Калгасцэнтру ў 24 гадзіны даць паказаньні Райза і Райкалгассаюзам.

7. Абавязаць усе Райза і Райкалгассаюзы скончыць правядзеньне другога ўкосу заліўных і балотных сенажацяй не пазьней 25 верасьня 1931г. забясьпечыўшы астаўленьне і зьняцьце насеннай канюшыны.

8. За абсалютна нездавальняючую ўборку, перавод калгасаў на зьдзельшчыну, сіласаваньне кармоў, загадчыкам Райза, і старшыням Райкалгассаюзаў: Нараўлянскага, Плешчаніцкага, Асьвейскага, Петрыкаўскага раёнаў абвясьціць вымовы, загадчыкам Райза, Райкалгассаюзаў: Заслаўскага, Менскага, Мазырскага, Парыцкага і Полацкага раёнаў паставіць на від, папярэдзіўшы ўсіх астатніх, што ў выпадку калі ня будзе дасягнуты пералом па правядзеньні ўсіх с-г кампаній у тэрміны, вызначаныя ЦК КП(б)Б, Наркамзем будзе прымаць меры прыцягненьня да судовай адказнасьці.

9. Пастанову гэту апублікаваць у друку.

Нам. Наркома Земляробства БССР
Масюкоў.

Старшыня Калгасцэнтру БССР
Міцькоў.

Сеюць неачышчаным насеньнем

Калгас «Чырвоны маяк» (Клічаўскі раён, Н. Максімавіцкі сельсавет) добра падрыхтаваўся да асеньняй сяўбы. Плошча для сяўбы азіміны падрыхтавана амаль цалкам. Увесь гной ужо вывезены і заараны. Інвэнтар адрэмантаваны. Расстаўлена на мясцох раб сіла. Падрыхтавана і патрэбная колькасьць насеньня, але яно не ачышчана. У калгасе няма машын для ачысткі насеньня, а праўленьне «Чырвоны маяк» не паклапацілася каб узяць машыну ў суседнім калгасе. Калгас ужо прыступіў да сяўбы. Уся плошча будзе засеяна неачышчаным насеньнем. Гэта зьявішча заўважаецца і ў іншых калгасах сельсавету.

Рубашны Е.

Трактарны парк заядае абязьлічка

Шклоўская МТС яшчэ не ліквідавала абязьлічкі ў адносінах да свайго трактарнага парку. Як правіла за трактарам не замацоўваецца пэўнага трактарыста. Кожны трактарыст мае права карыстацца любым трактарам. За машынамі ўстаноўлены слабы дагляд, а часамі заўважаюцца злачынныя адносіны да трактараў. Пасьля работы трактарысты іх ня чысьцяць. Трактары часта выбываюць са строю.

Слаба разгорнута барацьба за эканомію гаручага. Якасьць работы трактарыстаў зусім дрэнная. Пасьля работы трактара на полі застаюцца вялікія агрэхі.

Асабліва дрэнна працуе Гарадзішчанская трактарная калёна. Там, часам пасьля работы трактараў, калгасам прыходзіцца пасылаць пару коняй з плугамі, каб зьнішчыць агрэхі.

Брыгадзір гэтай калёны слаба сочыць за якасьцю работы. Часта трактарысты проста ня ўмеюць правільна пусьціць у ход трактар, ад чаго ломяцца шасьцёркі. Кіраўніцтву Шклоўскай МТС трэба зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу. Трэба павесьці барацьбу за якасьць работы трактарыста, ліквідаваць абязьлічку і асабліва змагацца з нядбайнымі і няўважлівымі адносінамі да машын. Тэхнічная пісьменнасьць сярод трактарыстаў вельмі нізкая, трэба і на гэта зьвярнуць увагу.

Г. Ш.

80 проц. усіх трактараў, 25 проц. конскага складу кінуць на зяблевае ворыва

Пастанова Калегіі НКЗ Саюзу ССР

1. Абавязаць Калгасцэнтр, Трактарацэнтр, наркамземы саюзных рэспублік, краявыя і абласныя земельныя кіраўніцтвы пераключыць на зяблевае ворыва ня менш 25 проц. конскага складу і ня менш 90 проц. усіх трактараў на Урале, Сярэдняй Волзе, Ніжняй Волзе; ня менш 80 проц. усіх трактараў у Заходняй вобласьці, Ленінградзкай вобласьці, Башкірыі, БССР, Маскоўскай вобласьці, Іванава-Вазьнясенскай вобл., Ніжагародзкім краі, ЦЧО і Татарыі; ня менш 75 проц. у Закаўказьзі, Казакстане і Сібіру; ня менш 65 проц. у Далёка-Усходнім Краі, на Паўночным Каўказе, у Крыме, на Украіне і ў Сярэдняй Азіі.

2. Устанавіць, што даныя НКЗемам і зацьверджаныя СНК СССР заданьні вобласьцям па зяблевым ворыве павінны быць выкананы; не пазьней 10 кастрычніка—на ўсёй спажываючай паласе, на Урале, у Башкірыі, Татарыі, Сібіры, Далёка-Усходнім Краі і БССР;

не пазьней 20 кастрычніка—на Сярэдняй Волзе, Ніжняй Волзе і ў Крыме;

не пазьней 10 лістапада—на Паўночным Каўказе, у Казакстане і на Украіне;

не пазьней 1 сьнежня—у Закаўказьзі і Сярэдняй Азіі.

3. Па сканчэньні азімай сяўбы пераключыць на ворыва зябу па ўсіх раёнах дадаткова 10 проц. трактараў і 25 проц. цяглавай сілы.

4. Абавязаць Трактарацэнтр забясьпечыць двухзьменную работу на трактарах на час зяблевага ворыва і прымацаваць да ўсяго складу трактараў і коней, што працуюць на зябу, на ўвесь пэрыяд зяблевага ворыва сталы склад аратых.

5. Прапанаваць НКЗемам саюзных і аўтаномных рэспублік, край і вобласьцей і калгассаюзам з прычыны труднасьцяй, якія паўстаюць у сучасны момант у разгортваньні зяблевага ворыва, пасылаць у раёны спэцыяльных упаўнаважаных па арганізацыі разгортваньня работы па зяблевым ворыве ў раёнах.

6. Даручыць сэктару вучоту арганізаваць апублікаваньне ў «Соц. Земледелии», «Правде», «Известиях» і мясцовым друку пяцідзённых зводак аб ходзе зяблевага ворыва па раёнах.

Народны Камісар Земляробства Саюзу ССР Я. ЯКАЎЛЕЎ.

25-га жніўня 1931 году.

Узяць фінплян пад бальшавіцкі рабселькораўскі нагляд

Апартуністы Быхаўскага райфа сарвалі фінплян трэцяга кварталу. На заводах „Варашылава“, „Бальшавік“, „Пралетары“ (Менск) шмат рабочых не ахоплена пазыкай. Адміністрацыя абутковай фабрыкі і Менскага аддзяленьня ВЭО пазыкавыя грошы трымаюць у сваіх кішэнях

Вінаватых у несваячасовай здачы грошай—да судовай адказнасьці

Таварышы, я прашу вас узяць пытаньне фінансавага пляну пад свой... бальшавіцкі, рабселькораўскі нагляд. Я прашу вас узяць увесь фінансавы апарат зьверху да нізу пад... абстрэл рабселькораўскай крытыкі, дапамагчы нам вытравіць з... фінансавага апарату... усе апартуністычныя, лянівыя, няздольныя элемэнты“ (Грынько)

Апартуністы зрываюць фінплян

У ліпені месяцы Быхаўскі раён трапіў на чорную дошку за невыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Здавался-б, што гэты ганебны прарыў павінен быў навучыць быхаўскіх работнікаў па бальшавіцкі па ўдарнаму ўзяцца за працу, каб выканаць фін пляны, сваячасова даць сродкі на сацыялістычнае будаўніцтва.

Фінплян ня выконваецца, а адказныя працаўнікі ў адпачынак

У раённай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе, якая павінна была весьці ўпартую барацьбу за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў панавалі апартуністычныя настроі.

Пачаць хоць-бы з таго, што на чале камісіі стаяў не старшыня РВК, як гэта ўстаноўлена ЦВК БССР, а загадчык райфа, адказны за фінансавую работу ў раёне.

У самую гарачую пару па рэалізацыі пазыкі і ліквідацыі прарываў па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў загадчык райфа (ён-жа старшыня раённай камісіі садзейнічаньня) і загадчык райашчадкасы—член камісіі—пайшлі ў адпачынак.

Вядома, што пры такіх бездзказных паводзінах з боку кіраўнікоў раённай камісіі садзейнічаньня, нельга было чакаць добрых вынікаў, як па мабілізацыі сродкаў, так і па іншай фінансавай рабоце.

Плян мабілізацыі сродкаў зрываецца

У трэцім квартале Быхаўскі раён павінен быў даць у парадку мабілізацыі сродкаў да 900 т. р. (859115 р. бяз страхавых пляцяжоў па сельсаветах б. Журавіцкага раёну). У лік гэтага за 40 дзён бягучага квартала з 1-VII па 11-VIII паступіла 99.137 р. альбо 11 проц. Асабліва ганэбна нізкі процант выкананьня заданьня па мабілізацыі сродкаў быў па распаўсюджваньні акцыі Трактарацэнтру—100 р. у лік 18.260 р., альбо 0,05 проц.; паявых узносаў па спажыўкаапэрацыі паступіла—6768 р. у лік 143578 р., альбо 4,7 квартальнага заданьня; зрываецца выкананьне пляну нават на абавязковых плацяжох; выканана 5,6%, тады як у папярэднія месяцы выкананьне абавязковых плацяжоў ішло ўперадзе дабраахвотных узносаў. Гэта становішча сыгналізуе аб слабасьці работы раённага фінансавага апарату.

Асабліва ганебнае становішча наглядаецца па паступленьні ўкладаў фізычных асоб. Па пляну чакалася, што на працягу ліпеня і жніўня м-цаў ашчадкасы Быхаўскага раёну дадуць прырост укладаў 26.500 р., але замест гэтага—за справаздачны пэрыяд было адліву 556 руб.

Панаваўшыя да гэтага часу сярод раённых працаўнікоў апартуністычныя настроі далі свае вынікі.

Агітматар'ял не скарыстаны

Дарэмна будзеце шукаць на сьценах устаноў і прадпрыемстваў лёзунгаў і плякатаў, прысьвечаных выпуску пазыкі «3-ці рашаючы год пяцігодкі». Нідзе ніводнага плякату і лёзунгу ня знойдзеце ня толькі у вёсцы, але нават і ў самім Быхаве, бо яны да гэтага часу спакойна ляжаць у раённай ашчадкасе. Прайшлі тэрміны рэалізацыі і афармленьня падпіскі сярод рабочых і служачых, а плякаты і лёзунгі ўсё яшчэ марынуюцца ў райашчадкасе.

Правал падпіскі на шклозаводзе „Ільіч“

Дзякуючы слабасьці працы заводзкай камісіі садзейнічаньня з агульнага ліку 441 штатных рабочых заводу «Ільіч» на 13-VIII ахоплена падпіскай толькі 347 асоб на суму 17.205 р., альбо 65 проц. месячнага заработку рабочых шклозаводу «Ільіч».

Неахоплена падпіскай 94 штатных рабочых. сярэдні месячны заробак якіх раўняецца суме 4.758 руб.

Значная колькасьць кваліфікаваных рабочых падпісалася на 10—20 проц свайго месячнага заробку. Некаторыя з іх падпісаліся толькі дзеля таго, каб «адчапіцца» ад праводзячых падпіску.

Майстра **Кажура Марка**, які зарабляе больш 100 руб. у месяц, адкрыта заявіў: **«каб хутчэй вы ад мяне адчапіліся, дайце падпішуся на 10 руб.».**

Кажура «ахвяраваў» на сацыялістычнае будаўніцтва 10 руб., а мясцовыя прафэсыйныя і партыйныя арганізацыі недаацанілі гэтага выпадку. Дзякуючы гэтаму па ганебнаму прыкладу **Марка Кажуры** пайшлі і другія майстры, якія пры сярэднім месячным заробку у 110—120 руб. падпісаліся на 25 руб.; напрыклад **Куль Алесь, Конеў Прохар, Казакоў Іван, Мядзьвецкі Леапард, Міхальскі Пётра і Іван Ступагаў М., Сударaў М.** і іншыя.

Радавыя рабочыя ўперадзе майстроў па падпісцы на пазыку

Мясцовыя арганізацыі ня здолелі скарыстаць для грамадзкага ўзьдзейнічаньня ідучых уперадзе у падпісцы тых добрых прыкладаў, якія паказалі рабочыя заводу: **Астроўскі Іван і Казлоў Міхась**, як'я пры пэнсіі у 45 руб. падпісаліся на пазыку на 75 р., альбо на 166,6 проц. месячнай пэнсіі.

Значная частка некваліфікаваных рабочых у большасьці жанчын, якія атрымліваюць па 30—35 руб. у месяц пад пісаліся на 100 проц. свайго месячнага заробку.

Ёсьць рабочыя, якія падпісаліся на суму значна перавышаючую месячны заробак. Напрыклад дзесятнік **Гай дукоў Ільля** пры заробку 115 руб. падпісаўся на 150 р., што складае 130 проц., **Квартальны Рыгор** атрымоўзае 80 руб. у месяц, а падпісаўся на 200 руб., альбо 250 проц., майстра **Кажура Захар** зарабляе у сярэднім 110 руб у месяц падпісаўся на 300 руб., альбо 273 проц.

Аднак асобныя добрыя прыклады падпіскі не змаглі ліквідаваць таго агульнага ярарыву, які утварыўся на заводзе з падпіскай на пазыку, дзе падпіска складае толькі 55,3 проц. сумы месячнай зарплаты штатных рабочых.

Буйнейшае прадпрыемства Быхаўшчыны, якое павінна было-б ісьці ўпередзе і весьці за сабой усе астатнія прадпрыемствы раёну, ганебна адстала супроць меншых прадпрыемстваў.

Сваячасова на гэта ніхто не зьвярнуў увагі і выпраўленьне памылкі, пачалося толькі тады, калі павінна было-б быць скончана ўсё афармленьне падпіскі.

Рэалізацыя пазыкі сярод калгасьнікаў праходзіць вельмі нездавальняюча

Асобныя калгасы і калгасьнікі Быхаўшчыны, паказваюць добрыя прыклады падпіскі на пазыку. Да такіх калгасаў трэба аднесьці калгасы: **Імя Галадзеда, Вузьніцкага сельсавету**, дзе 46 калгасьнікаў падпісалася на 2090 руб.; **«Згода»** Ніжанавіцкага сельсавету, дзе 74 калгасьнікі падпісаліся на 2210 руб., **«Рэвалюцыя»**—Быхаўска га сельсавету—71 калгасьнік на 2100 руб.; **«Чырвоны Партызан»**—Чырвона-Бярэжскага сельсавету—37 асоб на 1990 р.; **«Новы Сьвет»** Вузьніцкага сельсавету на 2210 руб. і г. д.

У калгасе імя Галадзеда старшыня калгасу Даўгалеў Парфен Мацьвеяў, машынавед Грыбоўскі Алесь Касьянаў, Грыбоўскі Эдвард Валяр'янаў, Грыбоўскі Рыгор Мікалаяў і іншыя падпісаліся на пазыку на 100 руб. кожны.

Побач з гэтым агульнае становішча з рэалізацыяй пазыкі сярод калгасьнікаў сыгналізуе аб правале. З агульнай колькасьці 160 калгасаў раёну, якія маюць 5449 гаспадарак, на 16-VIII атрыманы зьвесткі аб праведзенай падпісцы толькі па 54 калгасах на суму 50.345 руб., што складае 55,4 проц. заданьня, гэта бязумоўна сьведчыць аб яўным апартунізьме на практыцы да мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

У асобных калгасах сярэдняя сума падпіскі не перавышае 10 р. на аднаго падпісаўшагася. Гэткія прыклады мы маем у калгасе «Індустрыялізацыя»—Гарадзецкага сельсавету, «Новы мір» Вузьніцкага сельсавету, а ў калгасе «Чырвоны маяк» Студзенецка га сельсавету—14 асоб падпісаліся на 80 руб.

Ёсьць факты, калі на агульных сходах калгасьнікаў прымаецца агульная сума падпіскі, без разьмеркаваньня сярод калгасьнікаў і гэта лічыцца за афармленьне падпіскі.

74 калгасьнікі «Згоды», якія падпісаліся на пазыку на 2210 руб выклікалі на спаборніцтва калгасы «Пражэктар», «Новы Сьвет», імя Галадзеда, «Муравей», «Лупаўка»; «Чырвоная Гара», «Беларусь», «Чырвонаармеец», але чамусьці як піша праўленьне калгасу «Згода», гэты выклік заяўлены 23-VII да гэтага часу не абвяшчаецца ў раённай газэце «Маяк Камуны».

Прыведзеныя факты сьведчаць, што па Быхаўшчыне падпіска сярод калгасьнікаў праходзіла самацёкам, без патрэбнага кіраўваньня, без ужываньня мэтадаў саспаборніцтва паміж асобнымі калгасамі і калгасьнікамі і, што калгасны актыў, які паказаў добрыя прыклады правядзеньня падпіскі ў сваім калгасе не скарыстан для гэтай мэты у суседніх калгасах, дзе падпіска правальваецца.

Авансаваньне падпіскі

Раённыя арганізацыі, імкнучыся утварыць уражаньне «здавальняючага» ходу падпіскі сярод калгасьнікаў, у зьвестках аб ходзе падпіскі на 1-VIII штучна павялічылі падпіску на 24.000 руб. паказаўшы, што на гэтае чысло ўжо было праведзена падпіскі сярод калгасьнікаў на 55.000 руб., тады як фактычна на 10-VIII яшчэ было толькі 36.640 руб., а на 17-VIII—50.345 р. (па афіцыйных зьвестках райбанку).

Кантрольныя лічбы па сельсаветах не абгрунтаваны

Пасьля ўстанаўленьня першых кантрольных лічбаў па рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў прайшоў значны час, за які суадносіны паміж лікам аднаасобнікаў і калгасьнікаў значна зьмяніліся, бо з моманту вучоту аб'ектаў абкладаньня па с.-г. падатку быў прыліў у калгасы новых гаспадарак.

Ня гледзячы на гэта, лічбы застаюцца бяз зьмены. Па некаторых сельсаветах, з высокім процантам калектывізацыі выходзіць, што кожны двор аднаасобніка павінен быў-бы купіць аблігацыі пазыкі у сярэднім на 100—110 руб. Побач з гэтым па калгаснаму сэктару на адзін двор прыходзіцца ў сярэднім 10—15 руб.

Гэткі прыклад наглядаецца па Боханскім сельсавеце, дзе калектывізацыя праведзена на 86 проц.

Дадзеныя па сельсавету кантрольныя лічбы па рэалізацыі пазыкі падлягаюць пераразьмеркаваньню, бо відаць, што вызначаліся яны без экана мічнага абгрунтаваньня.

Так, Боханскі сельсавет мае 443 гаспадаркі і атрымаў заданьне на рэалізацыю пазыкі на 18.200 руб., а Кузьніцкі сельсавет—453 гаспадаркі задань не 96.000 руб.; Іскоснскі—535 гаспадарак—53000 р. і г. д.

Прэзыдыум Боханскага сельсавету вынес пастанову прыняць заданьне толькі у 8.000 руб., таму калі зараз-жа пераразьмеркаваньне ня будзе зроблена, то будзе значны недабор па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

Дабраахвотнасьць падмяняюць „лявацкімі“ загібамі

Некаторыя сельсаветы, як напрыклад Ніжня Тошчыцкі, рэалізуюць пазыку адміністрацыйным парадкам, даючы цьвёрдыя заданьні амаль што кожнаму двару.

Вось факт аднаго з гэткіх заданьняў, з якога відаць, што ўся праца праводзілася адміністрацыйным парадкам.

«Згодна пастановы прэзыдыуму сельсавету вам дадзена заданьне купіць аблігацыю 5-ці годка ў чатыры гады у сельсавеце на суму 50 руб.

За нявыкананьне гэтага будзеце аштрафованы.

29-VII—1931 г. Старшыня Ніжне-Тошчыцкага сельсавету (подпіс)».

Гэта бязумоўна зьяўляецца «лявацкім» загібам, з якімі партыя вядзе рашучую барацьбу. Старшыня Ніжня-Тошчыцкага сельсавету павінен памятаць, што ў нас падпіска на пазыку праводзіцца добраахвотна, а не ў прымусовым парадку.

Налічэньне падатку перарабляецца

Налічэньне сельска-гаспадарчага падатку не праверана перад уручэньнем акладных лістоў ,таму пасьля ўручэньня акладных лістоў робіцца значныя папраўкі. Напрыклад гр. в. «Чырвоны Берег» Казлову Андрэю выпісаны акладны ліст з паказаньнем с.-г. падатку —35 руб. 43 кап., а потым гэта сума перапраўлена сельсаветам на 101 р. 43 кап.

Налічэньне с.-г. падатку па Ісканскім сельсавеце цалкам перарабляецца.

Дзякуючы гэтаму акладныя лісты пачынаюць уручацца толькі пасьля 20 жніўня, гэта ў той час, як праводзіцца кампанія за датэрміновае паступленьне плацяжоў.

Да прыёму плацяжоў не падрыхтаваны

Пачалося паступленьне плацяжоў сельска-гаспадарчага парадку і страхоўкі. Здавалася-б, што раённыя арганізацыі зараз-жа арганізуюць бесьперабойны прыём плацяжоў, але кіраўнікі фінбанкаўскіх установ Быхава трымаюцца таго погляду, што платнік ад іх не ўцячэ і калі яму трэба заплаціць падатак, то няхай прыстасоўваецца да выходных дзён установ.

Быхаўскі райбанк і райашчадкаса карыстаюцца адзіным выходным днём і числа выходных дзён вызначаны вельмі няўдала. У базарны дзень, калі шмат платнікаў райбанк і райашчадкаса зачынены, і прымаць плацяжы некаму. Гэтак было 9 і 14 жніўня, платнікі хадзілі па Быхаву і шукалі установу, якая-б прыняла ад іх плацяжы сельска-гаспадарчага падатку і страхоўкі.

Сельскія ашчадкасы тыя зусім адмаўляюцца прымаць плацяжы сельска-гаспадарчага падатку і страхоўк, спасылаючыся на адсутнасьць паказаньняў.

Плацяжы ўзмацняюцца, а наш апарат яшчэ да гэтага часу не падрыхтаваўся да прыёму іх.

Дырэктывы аб пашырэньні сеткі ашчадкас ня выконваюцца

Для пашырэньня сеткі ашчадкас Быхаўскага раёну ёсьць усе магчымасьці, але дзяжуючы бязьдзейнасьці б. загадчыка ашчадкасы тав. **Гафта**, сетка ашчадкас не пашырылася. Адчыненая каса ў Ніканавічах не працуе з прычыны адсутнасьці неабходнага працаўніка.

На тэрыторыі раёну ёсьць буйныя саўгасы, якія не абслугоўваюцца ашчадкасамі.

Толькі цяпер абгаворваецца пытань не аб адчыненьні 25 сельскіх ашчадкас, якія павінны будуць ахапіць касавым абслугоўваньнем усе сельскія саветы і саўгасы.

Былое кіраўніцтва райашчадкасы і іншыя раённыя арганізацыі не жадалі што-небудзь зрабіць для стварэньня спрыяючых умоў у працы райашчадкасы. Райашчадкаса займае памяшканьне, дзе раней была піўная. Пасьля піўной ніякага рамонту не рабілася і таму можна сабе уявіць як «добра» выглядае гэта ўстанова.

На столі вісяць кавалкі абарваных абояў, усюды навалены патрэбныя і непатрэбныя паперы, сталы стаяць так шчыльна адзін каля другога, што калі за стол сядзе адзін супрацоўнік, то другі лезе на сваё месца... праз стол.

Калі новы загадчык райашчадкасы тав. Гардзейчык пажадаў прывесьці памяшканьне ашчадкасы ў парадак і ў першую чаргу пашырыць яго за лік кватэры, якая займаецца пазбаўленкай былой уласьніцай гэтага дому, дык Быхаўскі гарсавет і міліцыя не знаходзяць падстаў для высяленьня гэтай пазбаўленкі.

Бачыце пазбаўленка забраніравалася тым, што прыняла ў сваю кватэру зяця (рабочага-саматужніка), якому інтарэсы цёшчы - пазбаўленкі значна даражэй ,чым інтарэсы ашчадкасы.

Невядома ,чым кончыцца гэта барацьба за памяшканьне, вядома толькі што справа ад гэтага кульгае.

У апошні час праведзена ўзмацненьне фінансавага апарату Быхаўскага р., гэта дае надзею на рашучы пералом у фінансавай рабоце раёну.

Але вядома, што без дапамогі шырокіх грамадзкіх мас фінапарат ня справіцца адзін з тымі вялікімі задачамі ,якія ўскладаюцца на яго на даным пэрыядзе саспаборніцтва.

Прафарганізацыі Быхаўшчыны пачалі цікавіцца фінпрацай, але позна, трэба паправіць гэту памылку і паставіць сабе задачу штодзённа сачыць за работай фінапарату і калі трэба дапамагаць яму выконваць ускладзеныя на яго партыяй і ўрадам абавязкі па мабілізацыі сродак насельніцтва.

С. М.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў

сваячасовага афармленьня падпіскі і ўзносаў грошай па пазыцы „3-ці рашаючы“

Асноўная задача пазыкавай кампаніі ў горадзе ў сутасны момант—гэта афармленьне падпіскі, далейшае ўцягненьне новых падпісчыкаў і вылічэньне першага ўзносу. Пад кутом погляду гэтых пытаньняў Менская Гарадзкая КК РСІ сумесна з Гаркасцем і Дзяржбанкам арганізавала брыгады для праверкі на мясцох як адміністрацыя, камсоды, фабзаўмясцкомы і парт'ячэйкі выконваюць гэтыя задачы. На 20 жніўня згодна ўлічанай падпіскі (5.365.975) і паданых заявак для замацаваньня аблігацый (4.918.345) павінна было паступіць узносаў па пазыцы на 25 жніўня 245.900 руб., паступіла-ж толькі 139.946 руб., недапаступіла за 1-ю палову жніўня 106.000 руб., такое зьявішча гаворыць аб тым, што на мясцох пытаньню сваячасовага пералічэньня ўзносаў па пазыцы не надаецца належнай увагі, тое-ж самае і з ахопам уноў прыбыўшых рабочых.

Брыгадзірам КК-РСІ былі абсьледаваны ўсяго 50 прадпрыемстваў і ўстаноў—вынікі наступныя:

Завод Варашылава, які 1-шы ў асноным закончыў падпіску на пазыку і апошні падаў заяўку на замацаваньне аблігацый, на сёнешні дзень мае неахопленых падпіскай 320 чалавек, перш ы ўзнос у суме 4.527 руб. па галавацяпству адміністрацыі ня ўтрыман, «бо ніхто аб гэтым не сказаў што трэба ўтрымаць», калі брыгадзір зварочваўся ў бюро парткалектыву заводу, каб пагаварыць аб гэтым ненармальным становішчы, пасьледваў адказ: «няма зараз часу гаварыць аб пазыцы, заходзьце пасьля».

Цукерная фабрыка «Камунарка».

З 1101 працуючых на фабрыцы ахоплена падпіскай 688 чал. Неахоплена 413 чал., камсод на фабрыцы не працуе, работу вядзе касір, на неаднаразовыя звароты працаўніка ашчадкасы да мясцовых партыйных і прафарганізацый аб стварэньні працаздольнага камсоду, да гэтага часу нічога ня зроблена. Першы ўзнос у суме 2340 р.

У ашчадкасу не пералічан, адміністрацыя ня ведала, што гэта трэба зрабіць.

Скурзавод «Бальшавік».

Неахоплена падпіскай 160 чал., першы ўзнос у суме 4145 руб. ня ўнесены.

Праўленьне Саюзскуры.

Падпіска праведзена здавальняюча, толькі першы ўзнос пералічан менш на 176 руб.

Абутковая фабрыка.

Неахоплена падпіскай 353 чал., запазычанасьці першага ўзносу 3330 р. утрымана з рабочых па 1-VIII гг. 2762 руб., але да гэтага часу гэтыя грошы ў касу ашчадкасы не зданы.

Кантора ВЭО.

З 216 працуючых ахоплена падпіскай толькі 186 чал. Запазычанасьць 900 руб. 15-VIII утрымана 494 руб., але ў ашчадкасу ня зданы. Адміністрацыя несваячасовую здачу тлумачыць тым, што яны будуць грошы здаваць адзін раз у месяц.

Менцэрабкоп.

Запазычанасьць па пазыцы 4867 р. Неахоплена падпіскай 214 чалавек.

Шклозавод «Пралетары».

Неахоплена падпіскай 17 чалавек. Запазычанасьць 916 руб. Адміністрацыя кажа, што першы ўзнос будзе ўтрыман 15 верасьня гг., што сьведчыць аб тым, што для адміністрацыі заводу пастанова ўраду аб утрыманьні ўзносаў па пазыцы з заработку за першую палову жніўня зьяўляецца не абавязковай. Заўком і камсод у гэтай адносіне бязьдзейнічаюць. Гэта і зразумела, бо яшчэ ў пачатку кампаніі сам старшыня заўкому Сьцяпанаў выказаўся, што «Пазыку распаўсюджваць сярод рабочых не зьяўляецца справай заўкому, а справай працаўнікоў ашчадкас».

Швэйная фабрыка «Кастрычнік».

З 1862 працуючых на фабрыцы ахоплена падпіскай 1424 чал. Неахоплена 438 чал. Першы ўзнос у суме 7841 р. ня ўнесены.

Гэта далёка ня поўны сьпіс усіх адміністратараў і камсодаў, прадпрыемстваў і ўстаноў, якія зрываюць свае часовае фінісаваньне нашага сацыялістычнага будаўніцтва, можна было яшчэ шмат прывесьці прыкладаў, але хопіць гэтага, каб паказаць вінаватых у зрыве нашых фінплянаў.

Неабходна зараз-жа мясцовым партыйным і грамадзкім арганізацыям, асабліва камісіям садзейнічаньня дзяржкрэдыту ўзяцца за праверку як ідзе ўтрыманьне ўзносаў па пазыцы, дабіўшыся да 1 верасьня гг. 100 проц. унясеньня і пагашэньня па ўзносах запазычанасьці. Камсодам на мясцох, дзе яшчэ не ахоплены ўсе рабочыя і служачыя падпіскай, дабіцца на працягу аднэй дэкады 100 проц. ахопу ўсіх працуючых, вядучы неаслабленую работу і на далей па ахопу ўноў прыбываючых рабочых і служачых. Адміністрацыі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, на якіх ляжыць аба вязак сваячасова афармляць падпіску на пазыку і весьці дакладны ўлік па ёй, неадкладна вылучыць спэцыяльна га супрацоўніка для афармленьня падпіскі які-б цалкам адказваў за гэту работу.

Пастанова СНК Саюзу ССР ад 25 мая гг. № 393 аб узмацненьні практыкі безнаяўных разьлікаў па калектыўнай падпісцы на дзяржаўныя пазыкі павінна быць праведзена ў жыцьцё. Усе вінаватыя ў несваячасовым утрыманьні і пералічэньні ўзносаў па пазыцы павінны быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.

Гарадзкая пракуратура павінна тэрмінова заняцца і выявіць канкрэтных вінавайцаў зрыву паступленьня сродкаў.

Кіст.

Саветы—тварам да збожжазагатовак

Укамплектаваць штаты райспажыўсаюзаў

падрыхтаваць склады і тару для прыёмкі збожжа

Выканаць плян збожжазагатовак. Давесьці цьвёрдыя заданьні да заможна-кулацкіх гаспадарак

„Ніводнага цэнтнера збожжа прыватніку“ (ЦК УсеКП(б)

Узьняць тэмпы

Закончваецца ўборка ураджаю. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, а за ім і аднаасобны бліскуча спраўляюцца з задачай уборкі і абмалоту збожжа.

Зараз пачынаецца сяўба, пачынаецца новае кола сельска-гаспадарчых работ. Пачата адна з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній збожжазагатовак. ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб збожжазагатоўках адзначыў вялікае палітычнае значэньне гэтай кампаніі.

«Ніводнага цэнтнера збожжа прыватніку»—гэткі асноўны ўпор ў надыходзячай рабоце. Інфармацыі з месц, матэрыялы, зьмешчаныя сёньня ў газэце, гавораць аб тым, што збожжазагатоўкі ідуць самацёкам, сельсаветы не паставілі гэтыя пытаньні ў цэнтр сваёй увагі, з аднаасобным сэктарам не вядзецца ніякай работы (Дуброўна). Самае асноўнае зло ў хо дзе загатовак—гэта дрэнная работа загатоўцаў. Амаль усюды апараты райспажыўсаюзаў не ўкамплектаваны штатам загатоўцаў (Глускі раён, Дуброўна і г. д.). Амаль усюды не падрыхтавана тара і ня прыведзены ў парадак складзкія гаспадаркі.

Загатоўчыя органы і сельсаветы ня ўсё зрабілі для забясьпечаньня вывазкі збожжа з глыбінных пунктаў.

Саветы і райспажыўсаюзы павінны безадкладна разгарнуць шырокую работу па падрыхтоўцы да прыёмкі загатаванага хлеба. Трэба на працягу бліжэйшых дзён закончыць апошнія работы па падрыхтоўцы складаў, тары і бесьперабойнай транспартоўкі грузаў да станцый. Трэба ўзмацніць увагу да загатовак у аднаасобным сэктары і давесьці цьвёрды плян да заможна-кулацкіх груп вёскі.

Адмовіцца ад стаўкі на самацёк, энэргічна падрыхтавацца да загатоўкі, ажыцьцёвіць правільную клясавую лінію—гэта работа саветаў у адказ на заклік партыі, сфармуляваны ў ліпеньскай пастанове ЦК УсеКП(б).

Чырвоныя абозы са збожжам у Крупках

У цэлым радзе калгасаў, **Крупскага раёну, («Полымя», «Чырвоны пахар», «Чырвоны араты»,** імя **Варашылава** і інш.) скончана малацьба азімыні. У малацьбе калгасаў прымалі ўдзел і аднаасобнікі беднякі і сераднякі, якія падавалі заявы аб уступленьні ў калгас.

Закончыўшы малацьбу, калгасы **«Пралетарскай перамогі»** заверылі га» арганізавалі чырвоны абоз і 16-га жніўня здалі дзяржаве 6,5 тон збожжа.

Урачыста сустрэнутыя прадстаўнікамі пленуму РВК, калгасьнікі з **«Пралетарскай перамогай»** заверылі партарганізацыю і пленум у тым, што, пастаўленыя перад імі партыяй і ўрадам задачы, яны поўнасьцю выканаюць.

Я. Крынічны.

Кулацкая вылазка супроць збожжазагатовак

15 жніўня ў вёсцы **Мока, Хойніцкага раёну**, адбыўся агульны сход па загатоўках хлеба, сена, бульбы. Калгасьнікі і аднаасобнікі з кантрольнай лічбай згадзіліся. Кулацка-заможная частка старалася сарваць сход. Тых, хто падняў рукі, Ярмольчык Міхась. Ярмольчык Алесь назвалі сабакамі, «калі галасавалі, то і будзеце рабіць загатоўкі, а нам ня трэба загатовак»—так яны гаварылі. Гэта кулацкая вылазка не атрымала належнага адпору.

Сельсавету патрэбна прыняць захады да заможна-кулацкіх элемэнтаў.

Падарожнік Лясны.

Чырвоны абоз з хлебам. (Вендараскі с-с Магілеўскага р.).

Памяшканьне для ссыпкі збожжа і тара не падрыхтаваны

Кампанія збожжазагатовак у **Дуб-ровенскім раёне** яшчэ амаль не пачата. Апарат райспажыўсаюзу, які зьяўляецца асноўным загатоўцай, яшчэ ня поўнасьцю ўкамплектаваны. Памяшканьні для ссыпкі збожжа не падрыхтаваны, тары не хапае. Райкалгассаюз ня даў указаньняў калгасам аб сваячасовым абмалоце.

Такія «тэмпы» ходу збожжазагатоўчай кампаніі нічога ня варты. Яны павінны быць узмоцнены. **Макарэвіч.**

Загатоўка сена праходзіць слаба

БАБРУЙСК, 26-VIII. (Белта). Загатоўка сена на Бабруйскім пункце Саюзпрамкорму праходзіць слаба; плянавае заданьне па 5 раёнах Бабруйскага пункту Саюзпрамгасу выканана на 20-е жніўня ўсяго на 40 проц. гадавога заданьня.

Загатоўка сена за апошнюю пяцідзёнку рэзка панізілася. Першымі па загатоўцы сена ідуць Асіпавіцкі раён, які выканаў сваё заданьне на 83 проц., Бабруйскі на 65 проц.

МАЗЫР, 26-VIII. (Белта). Загатоўка сена ў раёне праходзіць зусім нездавальняюча. Калгасамі выканана ўсяго 14 проц. пляну, а аднаасобнікамі 10,1 проц. По саломе калгасамі выканана—13 проц., а аднасобнікі—15 проц.

Плянавая нарада сакратароў адзначыла бязьдзейнасьць па асобных сельсаветах парт'ячэяк у галіне нацыску на кулацка-заможныя гаспадаркі, па выкананьні ўсіх відаў загатовак. **Райком КП(б)Б** прыняў рашэньне аб пасылцы ў раён 40 чалавек для ўзмацненьня загатовак рознага віду.

Апарат райснабу не ўкамплектаваны

ДУБРОЎНА. Ня гледзячы на тое, што па БССР пачаліся ўжо збожжазагатоўкі, у Дубровенскім раёне гэта работа яшчэ амаль не пачата. Памяшканьні пад ссыпку не падрыхтаваны, з тарай таксама ня ўсё добра.

Райкалгассаюз ня даў калгасам указаньняў па сваячасовым абмалоце, але ўсё-ж некаторыя калгасы збожжа абмалацілі і гатовы да здачы («1 Май», Расткоўскага сельсавету і інш.).

Сярод мабілізаваных у сельсаветах ёсьць людзі якія і цяпер ня думаюць ударнай работай ліквідаваць маруднасьць тэмпаў.

Трэба рашуча зьнішчыць маруднасьць тэмпаў хлебазагатовак. **М.**

Напярэдадні навучальнага году

Лічаныя гадзіны засталіся да „Дню вучобы“

У Магілеве ня здолелі забясьпечыць нармальны пачатак заняткаў у школах. Школы Талачынскага раёну яшчэ ня маюць праграм і падручнікаў

Вінаватых у зрыве навучальнага году—да суровай адказнасьці

„Нічога не рабілі і не маглі рабіць“

Магілёў. (Наш. кар.). Рэйд па праверцы падрыхтаванасьці да навучальнага году выявіў, што райвыканком, гарсавет, інспэктарыят нарасьветы, райпрафсавет парт'ячэйкі і фабзаўмясцкомы амаль ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы ня прымалі. У выніку вялізарны прарыў.

Дагэтуль **райпрафсавет нічога не зрабіў для мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б у галіне культурнага будаўніцтва.** Калі брыгада зьвярнулася да загадчыка культсэктару райпрафсавету **тав. Анісава**, дык ён адказаў:

— «Нічога не рабілі і не маглі рабіць».

Трэба проста сказаць, што **райпрафсавет школам не аддае ніякай увагі, разважаючы, што «гэта справа не яго, няхай гэтым займаецца саюз працасьветы».**

Саюз-жа працасьветы таксама стаіць у баку ад гэтай важнейшай кампаніі і, за выключэньнем некалькіх нарад, скліканых за апошні час па гэтым пытаньні,—нічога не зрабіў. Райпраўленьне асьветнікаў ведала, што 4-ая школа ня мае памяшканьня, а 13-ая і 15-ая школы патрабуюць капітальнага рамонту, ведала і нічога не зрабіла, каб дапамагчы школам. Больш таго, **райпраўленьне працасьветы ня мае нават пляну па падрыхтоўцы да навучальнага году і ўся работа праходзіць самацёкам.** Укамплектаваньне школ настаўнікамі ідзе надзвычайна марудна.

У Магілеве, у зьвязку з пашырэньнем усеагульнага навучаньня, школамі трэба ахапіць 8.107 чал. супроць леташніх 6.922. Між тым, гарсавет не паклапаціўся, каб забясьпечыць вучняў памяшканьнямі для навучальных мэтаў і для інтэрнатаў. Паводле прыблізных падлікаў, **інтэрнатаў ня хопіць на 1.600 чалавек.**

Леташнія прарывы ў галіне забясьпечаньня школ апалам ні чаму не навучылі гарсавет. Памылкі паўтараюцца. Да гэтага часу школы забясьпечаны апалам толькі на 30 проц. Не наладжана справа і з грамадзкім хрчаваньнем. Яшчэ горш справа з забясьпечаньнем школ падручнікамі і навучальнымі прыладамі. **Для школ патрэбна 59.000 падручнікаў, а пакульшто ёсьць толькі 12.000,** зусім дрэнна справа з забясьпечаньнем школы сшыткамі. У аддзяленьні Белдзяржвыдавецтва замест баявой і чоткай работы назіраюцца самацёчныя настроі; нічога ня робіцца і ў Магілеўскім ЦРК.

Белдзяржбуд ня выконвае дагавору па школьным будаўніцтве **кіраўнікі аддзяленьня Белдзяржбуду заяўляюць, што «гэта будаўніцтва ня ўдарнае і можа пачакаць».**

Райком партыі павінен неадкладна спыніць гэтую бязьдзейнасьць і прымусіць магілеўскія арганізацыі і ўстановы павярнуцца тварам да навучальнага году і па-баявому ўзяцца за ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК КП(б)Б.

А. Нёманскі.

Узяліся за ліквідацыю прарываў у Буда-Кашалёўскім раёне

У справе падрыхтоўкі да навучальнага году па Буда-Кашалёўскім раёне на сёньняшні дзень маецца значны лік буйных прарываў. Асабліва кепска справа абстаіць з памяшканьнямі. Пашырэньне ў гэтым годзе школьнай сеткі на 35 камплектаў 1-га канцэнтру і на 4 групы II-га канцэнтру патрабуе прыстасаваньня значнай колькасьці новых будынкаў, якое можа быць зроблена за кошт скарыстаньня кулацкіх дамоў і пабудовы новых школ. Але некаторыя сельсаветы мала цікавяцца школьнымі справамі і да гэтага часу нават ня ведаюць ці адчыняюцца ў іх раёне новыя камплекты, ці не, і падрыхтоўкі ніякай не вядуць.

Кулацкія будынкі замест таго, каб у першую чаргу замацаваць іх за культасьветнымі ўстановамі, распрадаюцца (Недайскі сельсавет). Існуючыя школы не рамантуюцца, новае будаўніцтва або не пачата, або спынена. Некаторыя школы ня скончаны (Іванаўская школа), або зусім не пачалі будавацца (Б.-Кашалёўская школа) з-за адсутнасьці цэглы для печак і падмуркаў у той час, калі ўмовы Буда-Кашалёўскага раёну дазваляюць поўнасьцю і сваячасова задаволіць усе аб'екты будаўніцтва цэглай і чарапіцай. Справа ў тым, што Сампрамсаюзам на радзе сваіх цагельных прамфінплян ня выконваецца, дзякуючы, часам, зусім нязначным прычынам. Прыкладна, Недайскі завод, маючы звыш 60 рабочых, ужо на працягу некалькіх тыдняў ніяк не дагаворыцца з бліжэйшымі калгасамі або сельсаветамі аб найме 4—5 чалавек чорнарабочых для выкапкі катлавана пад гарном для загатоўкі цэглы. Ад гэтага некалькі дзесяткаў тысяч цэглы будзе недадана нашаму будаўніцтву.

Будаўніцтва Рагінскай школы спын

Перадавую агратэхніку--сацыялістычнаму земляробству

Сотні і тысячы цэнтнераў лёну гіне з-за ігнараваньня прасьцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў. Зяблевае ворыва--важнейшы сродак узьняцьця ўраджайнасьці лёну

Лён—важнейшая галіна сельскай гаспадаркі БССР. Узброіць шырокія масы калгасьнікаў і саўгасьнікаў тэхнікай лёнаводзтва—важнейшая задача ўсей пралетарскай грамадзкасьці

Пад лён рыхтаваць поле з восені

Раньняе ўзорваньне зябу дае лепшы ўраджай

Лён і канопл: ў нашай сацыялістычнай гаспадарцы займаюць досыць значнае месца і маюць надта вялікае гаспадарчае значэньне. Наколькі значнае месца займаюць гэтыя культуры ў нас паказвае хоць бы тое, што нашай краіне належыць звыш 75 проц. пасеўнай плошчы сусьветнай вытворчасьці лёну і канапл..

Пасеўная плошча лёну і канапель, таксама і іх прадукцыя, дзякуючы шпарку росту і разьвіцьцю буйнай сацыялістычнай гаспадаркі—саўгасаў і калгасаў ,на базе машынізацыі з кожным годам пашыраецца і расьце і ўжо перавышае даваенны ўзровень.

Мэханізацыя лёнаканапляводнай вытворчасьці ідзе шпаркім тэмпам наперад. Будуецца каля 500 заводаў, па першапачатковай апрацоўцы. На палёх сацыялістычных гаспадарак пойдуць працаваць новыя тысячы лёнапераробак, малатарняў і недалёк час дэкарыкатараў і лёна-камбайнаў. Ход сацыялістычнай рэканструкцыі лёнаканапляводнай вытворчасьці адкрывае для лёна-канапляводнай гаспадаркі ня бачныя да гэтага прасторы разьвіцьця і росту. Наша краіна стала краінай самай буйнай сельскай гаспадаркі ў сьвеце. Сацыялістычная рэканструкцыя ня толькі зьмяніла сацыяльны характар лёнаводнай гаспадаркі, яна зьмяніла ўсё старое і ў прыёмах тэхнікі лёна-канапляводзтва. І наша задача, як мага хутчэй выкарчаваць усё адсталае ў прыёмах тэхнікі.

Мы часам можам бачыць, калі побач з поўнай мэханізацыяй большасьці працэсаў у лёнаводзтве ўжываюцца прыёмы земляробскай тэхнікі, якія ўжо даўно аджылі. Вынікам гэтых адсталых прадзедаўскіх прыёмаў зьяўляецца тое, што да апошняга часу мы маем у два разы ураджай меншы, чым у многіх краінах Заходняй Эўропы. Адным з такіх прыёмаў зьяўляецца ўзорваньне пад лён і канопл. Звычайна прыцята лічыць, што лён расьліна мала вымагальная, яна можа мірыцца з усякімі ўмовамі і таму да падрыхтоўкі глебы пад яе адносяцца зусім няўважліва.

Між тым лён мае параўнальна слабую каранёвую сыстэму і для свайго разьвіцьця патрабуе спажыўных матэрый у легкай растворнай форме. Працэсы пераводу трудна растворных пажыўных матэрый у легкарастворныя адбываецца інтэнсіўна якраз толькі ў добра ўспухнаній, з дастатковай колькасьцю вільгаці, глебе. Прадуктам гэтага працэсу зьяўляецца салэтра і як паказваюць досьледы Валакаламскага дасьледчага поля накапленьне салетры ў глебе ідзе наступным чынам: канюшынішча, узоранае восеньню дае да пачатку мая 217 кгр. салетры на га, узорнае вясною толькі 16 кгр, на га. Значыць, на ўзоранным з восені канюшынішчы накапленьне лёгка-растворных пажыўных матэрый ідзе надта інтэнсіўна і наадварот, у шчыльнай глебе гэтыя працэсы зусім затрымліваюцца. Такое-ж стано вішча мы маем і на другіх папярэдніках. Лён вымагальны і да вільгаці ў глебе. Накапленьне вільгаці, патрэбнае для лёну, таксама ідзе розна. На ўзоранай з восені глебе частыя дажджы ўвосень, а за тым і сьнегавыя воды вясною, у значнай сваёй частцы ўсмоктваюцца глебаю і увесну, калі становіцца цёпла і пачынаецца праграваньне глебы ствараюцца спрыяючыя ўмовы для інтэнсіўнай работы бактэрый у глебе ,якія садзейнічаюць пераводу цяжка-растворных пажыўных матэрый у лёгкарастворныя, патрэбных для разьвіцьця лёну

На няўзоранай шчыльнай глебе большасьць веды сьцякае і для лёну яна прападае. Даступ паветра да каранёвай сыстэмы лёну таксама лепшы ва ўзоранай успухканай з восені глебе. Ды і сама глеба, як асяродзішча для разьвіцьця каранёвай сыстэмы, узораная з восені, зьяўляецца найбольш спрыяючай. Веснавое ворыва, апроч паказаных недахопаў, адцягвае і позьніць пасеў лёну, што само па сабе ўжо зьніжае ўраджай валакна і лёнасеня Аб гэтым досыць яскрава гавораць матар'ялы дасьледчых станцый. Так, напрыклад, 4-гадовыя досьледы Пскоўскай ільнянай станцыі паказваюць, што спазьненьне пасеву зьніжае ўраджай лёнасаломы і лёнасеня ажда 56 проц. у параўнаньні з раньнімі тэрмінамі сяўбы. Аб гэтым сьведчыць і практыка сёлетняга году, калі раньняя пасевы лёну маюць значную перавагу. На Пскоўскай ільнянай станцыі, якая праводзіла досьледы некалькі год па асеньнім і веснавым ворыве заўсёды атрымлівалося прыбаўка ўраджаю лёнасаломы ад 16 да 48 проц., лёнасеня да 52 проц. па асеньнім ворыве. Тое-ж самае мы маем і па другіх дасьледчых установах—Валакаламскае дасьледчае поле, па асеньнім ворыве атрымала ўраджай па лёнасаломе на 33 проц., а лёнасеня на 13 проц. вышэй чым па веснавым ворыве. На дасьледчым полі б. Ціміразеўскай с-г Акадэміі ў сярэднім за 6 гадоў асеньняе ворыва давала на 480 кгр. саломы і на 112 кгр. лёнасемя больш, чым па веснавым ворыве.

Але па асеньнім ворыве мы атрымліваем ня толькі большы ўраджай па колькасьці, але і па якасьці лепшае валакно—большы выхад доўгага валакна ,меншы адход у паклю, валакно вышэйшага нумару—на 2-3 нумары. Па асеньнім ворыве наглядаецца—лепшае, больш інтэнсіўнае разьвіцьцё самога лёну, наглядаецца раней шае зацьвітаньне і сьпеласьць і, дзякуючы гэтаму, уборка таксама наступае раней на цэлых 6 дзён.

Для паўночных раёнаў савецкай Беларусі, якія ўжываюць для падрыхтоўкі да апрацоўкі лёнасаломы мочку, гэта мае асабліва вялікае значэньне, бо дае магчымасьць раней замачыць пры лепшых тэмпэратурных умовах, ад чаго мочка ідзе значна хутчэй. Так, напрыклад, 3-гадовыя наглядзінні даюць наступныя даныя:

Тэрмін уборкі лёну	Кольк. дзён мочкі	Тэмпэратура вады.
II	6,3	17,3
III	8,3	16,0
IV	10,3	13,0
V	14,0	11,0

Траста таксама доўга не затрымліваецца на сьцелішчы, добра адлежваецца і адбельваецца за кароткі тэрмін, дзякуючы багатым росам, цёплым дажджом і сонечным днём раньняга асеньняга часу.

Усе навуковыя даныя гавораць за неабходнасьць асеньняга ворыва і толькі старыя традыцыі і руціна ў гэтым пытаньні перашкаджаюць часта правільна апрацаваць глебу пад лён і атрымаць большы ўраджай валакна і семя.

Як вядома, лён дае лепшы ўраджай па канюшынішчы і на навіне або далінах, але толькі ў тым выпадку, калі гэтыя землі правільна апрацаваны. Як канюшынішча, так і навіны патрэбна падняць на зяб, як мага раней, з восені, каб даць магчымасьць перавернутаму дзірвану лепш прамерзнуць і перапрэць за зіму. Падняты дзірван позна ўвосені, перад самымі марозамі не пасьпявае перапрэць і не дае таго эфэкту, як атрымліваецца пры раньнім ворыве і мала чым тады адрозьніваецца ад веснавога ворыва. Падняты дзірван увесну ляжыць не перапрэлым у той час, калі лён больш за ўсё патрабуе для свайго росту як вільгаці, так і лёгка-растворных пажыўных матэрый. У часе сухой вясны лён на ўзоранай вясною цалкам зусім ня родзіцца.

Глебы, вызваленыя з-пад іншых культур з пажніўнымі рэшткамі, таксама неабходна як мага раней падняць на зяб. Араць трэба на поўную глыбіню ворнага пласту, але не вырочваць ні ў якім разе падворнага пласту. Лепшае ворыва, як паказваюць досьледы, атрымліваюцца пры трактарным ворыве.

Т. Мяцельскі.

Вялікія страты ўраджаю лёну—

вынік ігнараваньня агратэхнічных мерапрыемстваў

Гарадоцкі раён зьяўляецца адным з буйных лёнаводных раёнаў БССР. Па севы лёну ў 1931 г. займаюць 10.650 га, а пасьля далучэньня да яго Межанскага раёну, (акрамя 2-х с-с.), плошча пад лёнам дасягае 14500 га. У паасобных калгасах лён займае да 30—40 процантаў ад пасеўной плошчы. Калгасы—імя Крупскай, Вайханскага сельсавету, Ленінскі Шлях, Кузьмінскага с-с. і «Чырвоны Пуцілавец», Вірулянскага с-с).

У параўнаньні з мінулым годам, плошча пад лёнам вельмі павялічылася—з 3500 га у 1930 г. узрасла да 10.650 га у 1931 г., альбо на 300 проц. у межах раёну да пашырэньня.

Агульная пасяўная плошча пашырана на 21,11 проц. у параўнаньні з 30 г. за кошт хмызьнякаў, залежаў і аблогаў, гэтыя новыя землі скарыстоўваліся, галоўным чынам, пад лён.

Раён калектывізаваны па зьвестках на 20 жніўня 1931 г. на 49,3 проц. бедняцка-серадцякіх гаспадарак. Прылічнясупынна працягваецца. Павялічваецца колькасьць саветаў з суцэльнай калектывізацыяй (Вірулянскі, Кузьмінскі с-с.).

Раён дасягнуў значных посьпехаў, дзякуючы цьвёрдаму і правільнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б і дзякуючы бязьлітаснай барацьбы з усякага роду скрыўленьнямі генэральнай лініі партыі, як з «левым» антысераднякім за гібам, так і правым ухілам, апартуністычным самацёкам у справе выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Глебу з восені не падрыхтавалі, сяўба праводзілася ўручную

Веснавая сяўба праходзіла ў напружаных абставінах. Ня гледзячы на позьнюю вясну сяўба была спаткана не падрыхтаванай. Новыя землі і канюшынішча пад лён у большай частцы з восені ня былі ўзораны, а адсюль, і напружанасьць і спазьненьне з гэтай адказьнейшай працай.

Плошчы пад лён свячасова ня былі вызначаны. Насеньне на ўсю пасеўную плошчу ня было пратручана. Даставка і свячасова ня былі зьвезены штучныя ўгнаеньні. Прапушчаны раньня тэрміны сяўбы, слаба праводзіліся аграмерапрыемствы па падвышэньні ўраджайнасьці лёну і інш. культур.

У выніку адзначаных прычын і шмат іншых перашкод ,становішча лёну па Гародоцкім раёне, па агледжаных 5-ці с-с: Вайханскім, Канчанскім, Селішчанскім, Вірулянскім і Кузьмінскім—па самых ільнаводных калгасных вузлах, можна характарызаваць 2—2,5 адзінкамі па пяцібальнай сыстэме.

Рост лёну ў агульнай масе ніжэй сярэдняга—каля 50—60 см. Відавочна маюцца адхіленьні, г. зн. менш 50 і вышэй 65 см.

Па агульным уражаньні, захворваньне грыбнымі хваробамі ў гэтым годзе значна меншае, чым у мінулым годзе. Асабліва спрыяючымі аказаліся сродкі пратручваньня насеньня. Маюцца выпадкі, калі у адным калгасе, вучасткі ўпяршыню занятыя лёнам, засеяныя адным пасеўматарыялам і з аднальковымі іншымі ўмовамі,—але-ж, пасеў матарыял высяваўся пратручаным, або без пратручваньня—і, гэта дало рэзкія адзнакі.

Засьмечанасьць травастою лёну незначная, за выключэньнем асобных выпадкаў і зусім чыстыя ляны на праполачных палёх.

Акрамя таго, як і трэба было чакаць, больш чыстыя ляны на новых землях і канюшынішчах, у параўнань ні з лёнам на мяккіх глебах.

Трэба заўважыць, што праполачная кампанія ляноў прайшла нездавальня юча. Нават у сацыялістычным сэктары, поліва лёну лічылі апошняй справай і займаліся ёй, калі быў час.

Трэба меркаваць, што і з боку раённых арганізацый, ня было зьвернута патрэбнай увагі, а таму, поліва лёну, як адно з галоўных аграмерапрыемстваў па падвышэньні ўраджайнасьці, ня было належна ажыцьцёўлена па Гарадоцкім раёне.

Самымі галоўнымі недахопамі сяўбы лёну ў гэтым годзе па Гарадоцкім раёне, якія значна панізілі ўраджайнасьць лёну, гэта вельмі рэдкія і позьнія пасевы лёну.

На 500 тысяч руб. недаатрымана прадукцыі

На падставе навукова-абгрунтаваных досьледаў, сёлета, была выдана пастанова Галоўленкому аб абавязковым ажыцьцяўленьні раду агратэхнічных мерапрыемстваў па падвышэньні ўраджайнасьці лёну. У ліку гэтых мерапрыемстваў увайшлі і нормы па гушчыні высеву. Там указана: «высеў насеньня праводзіць па лёне і канаплях у колькасьці 1,1—1,3 цнт. на га з разьліку 100 проц. гаспадарчай годнасьці насеньня». У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б за 4 красавіка 1931 г., таксама была зазначана аб неабходнасьці высеву лёну 100 кгр. на 1 га гаспадарча-годнага насеньня пры радковым высеве і 120—130 кгр. пры раскідным высеве.

Гэтыя аграмерапрыемствы па Гарадоцкім раёне ня былі ажыцьцёўлены. Па раёне дадзена была ўстаноўка:



высеваць 1 цнт. насеньня на га без усялякага разьліку на гаспадарчую годнасьць. А адсюль, на практыцы атрымалася, што прыкладна пры чыстаце насеньня ў 95 проц. і ўсхожасьці 80 проц., гаспадарчая годнасьць атрымалася ў 76 проц., г. зн., каля 25 проц. зьмяншэньня нармальна-гаспадарчага высеву, або 60—75 кгр. на гект.

Па 5-ці гадавых дадзеных б. Ільняной станцыі Ціміразеўскай с-г Акадэміі, высеў 75 кгр. на га, у параўнаньні з высевам у 120 кгр., прыносіць зьмен шаны ўраджай па трэпаным валакне да 35—40 проц. і 20—25 проц. зьмяншэньня ўраджаю насеньня.

Дрэнна адбілася на ўраджайнасьці лёну і тое, што ў большай частцы новыя землі, якія галоўным чынам пайшлі пад лён, ня былі ўзораны з восені, іх прышлося араць увесну, а ў некаторых мясцох з вялікім спазьненьнем.

На такіх землях без належнай падрыхтоўкі глебы ўраджай лёну атрымаўся слабы ці зусім загінуў.

Сяўба лёну праводзілася ўручную. Нічога ня было зроблена каб мэханізаваць сяўбу. Звыклая да рэдкіх пасеваў рука селяніна, захоплівала з каробкі ня поўную жменю насеньня, у выніку чаго пасевы атрымаліся рэдкія.

Вядучы барацьбу за стварэньне сыравінай базы для нашых тэкстыльных прадпрыемстваў і маючы значныя посьпехі ў пашырэньні плошчы падтэхнічныя культуры,—патрэба таксама рашуча дабівацца і падвышэньня ўраджайнасьці іх. Да пасеву лёну будучага году патрэбна рыхтавацца загадзя,—з восені:

Каб папярэдзіць памылкі гэтага году трэба правесьці наступнае:

1. Неабходна, як мага хутчэй падняць на зяб усе новыя землі, правільна праводзячы асноўнае ворыва дзярніны.

2. Патрэбна наогул усе плошчы пад лён у 1932 г. абавязкова падняць на зяб.

3. Атрыманы ўраджай насеньня з усёй дасканаласьцю адсартаваць і належна захаваць да будучай вясны, недапускаючы больш 12-15 проц. вільгаці насеньня пры захаваньні.

4. Да будучага году, як мага больш загатовіць патрэбных штучных угнаеньняў, якіх вельмі мала ўнесена ў 1931 г.

5. Правільна вытрымаць пераадпасеўную веснавую апрацоўку глебы ў 1932 г.

6. Ні ў якім разе не затрымлівацца з пасевамі лёну, каб закончыць сяўбу не пазьней 1 чэрвеня.

7. Адкінуць дзедаўскія прыёмы высеву лёну і перайсьці на механізаваныя спосабы.

8. Не дапускаць рэдкіх высеваў лёну, а высяваць ня менш 1,2—1,3 цнт. на га гаспадарчага годнага насеньня.

9. Узброіць рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і астатніх беднякоў і серадняковаў аднаасобнікаў тэхнічнымі ведамі па падвышэньні ўраджайнасьці лёну і ажыцьцяўленьні плянаў 1932 г.

10. Рашуча змагацца з недабітым клясавым ворагам на вёсцы,

Вось тыя асноўныя задачы, якія будуць стаяць у радзе іншых мерапрыемстваў па забясьпячэньні больш пасьпяховага правядзеньня пляну сяўбы тэхнічных культур у 1932 г.

А. Караткевіч.



Будаўніцтва буйнейшага ў БССР шча ціна-шчотачнага камбінату.

Ільна-канапляная кастрыца--сыравіна для папяровай прамысловасьці

Пры сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі СССР і БССР аднэй з важнейшых задач зьяўляецца пашырэньне сыравіннай базы нашай прамысловасьці, па-першае-за кошт ад шуканьня новых відаў сыравіны , па-другое,—за кошт найбольш рацыянальнага выкарыстаньня адкідаў гэтай прамысловасьці. У даным выпадку, у парадку пастаноўкі пытаньня, трэба зьвярнуць увагу зацікаўленых навукова-дасьледчых і гаспадарчых устаноў БССР, а таксама і ўсяе савецкае грамадзкасьці на адзін від адкідаў нашай сельска-гаспадарчай прамысловасьці, а іменна: на ільняна-канапляную кастрыцу, як сыравіну для папяровай прамысловасьці.

Як вядома, асноўнай сыравінай для фабрычнага вырабу паперы спачатку было рызьзё. З пашырэньнем гэтай прамысловасьці асноўнай сыравінай для яе стала драўніна (ёлка, асіна, то паль, піхта), з рызьзя-ж вырабляюцца толькі найбольш каштоўныя сарты паперы.

У спадчыну ад царызму Савецкаму Саюзу дасталася менш паловы (95 з 212) папяровых фабрык былой Расіі і прытым, амаль самыя горшыя фабрыкі. Савецкая ўлада рэканструявала амаль усё гэтыя фабрыкі. Разам з тым пабудаваны аграмадны Балахнінскі папяровы камбінат (каля Н. Ноўгарада). Усё гэта ў значнай меры пашырала вырап паперы ў Саюзе. Але для задавальненьня культурных запатрабаваньняў рабоча-сялянскіх працоўных мас Савецкага Саюзу гэтага далёка недастаткова. У зьвязку з гэтым прышлося значную колькасьць паперы і паўфабрыкатаў для яе ўвозіць з па-за межаў.

Амаль з першых дзён свайго існаваньня савецкая ўлада прыняла ўсе меры да хутчэйшага пашырэньня вырабу сваёй паперы. На працягу бягучай пяцігодкі, апрача пабудовы Балахнінскага камбінату, распачата ў розных раёнах саюзу пабудова яшчэ другіх 27 папяровых фабрык. Амаль усе гэтыя фабрыкі пачнуць дзейнічаць у 1931-32 годзе. Разам з старымі новыя фабрыкі дадуць да канца пяцігодкі 1.070.000 т. паперы, (каля 8 кгр. на чалавека). А гэта дасьць нам магчымасьць абагнаць цэлы рад перадавых капіталістычных дзяржаў у колькасных і ў якасных адносінах,—па колькасьці кніжак, якія запроектавана надрукаваць у канцы пяцігодкі, мы абгонім нават Амэрыку.

На ўсіх сучасных папяровых фабрыках папера вырабляецца галоўным чынам з драўніны. У сярэднім на адну тону паперы трэба каля 6 кб. м. драўніны, г. зн. што ў канцы 5-годкі на вырап паперы патрэбна будзе каля 6 м. кб. м. драўніны, ці каля 30.000 га лесу ў год. Вялізарныя выдаткі драўніны часткова і паслужылі прычынай да адшуканьня новых відаў сыравіны для вырабу паперы. У Амэрыцы ўжо зараз папера вырабляецца з кукурузных сьцяблоў, у Італіі—з саломы. У нас у СССР акад. Пранішнікавым пастаўлена пытаньне аб больш шырокім выкарыстаньні саломы для вырабу паперы. **На мой погляд, яшчэ большай увагі заслугоўвае ў гэтай справе ільняна-канапляная кастрыца.**

У той час, калі салома можа ня толькі служыць добрай падсьцілкай для жывёлы, але з посьпехам можа быць і скормлена гэтай жывёле, кастрыца як-быццам прыгодна толькі ці ў якасьці паліва, ці ў якасьці дамешкі для атрыманьня саманнай цэглы. Пакульжа што кастрыца ў БССР скарыстоўваецца ў лепшым выпадку як матарыял для ўцяпленьня стопак, у горшым—ёю засыпаюць ямы на вясковых дарогах.

З саломы пакуль-што атрымліваюцца толькі найбольш нізкія сарты паперы, тады як з кастрыцы магчыма ўжо атрымаць найлепшыя сарты паперы.

У нас, у СССР рабіліся досьледы па скарыстаньні кастрыцы для вырабу паперы, прычым «пытаньне аб скарыстаньні саломы лёну-кудрашу, магчыма лічыць амаль вырашаным... Салома лёну-кудрашу, дзякуючы сваёй высокай тэхналёгічнай якасьці, у значнай ступені палепшыць якасьць выробленага тавару» [1]) паперы). Прычым, кошт гэтай паперы будзе непараўнаўча таней кошту паперы з рызьзя, бо салома «лёну-кудрашу больш чым на палову таньней аднэй тоны рызьзя адпаведнай якасьці» [2]).

Якія магчымасьці ёсьць у гэтых адносінах ў нас, у БССР? Ужо на 1932 г. у нас запроектавана 350.000 га лёну і 60.000 га канапель. Калі прыблізна ўзяць 12 ц. саломы (без валакна) з 1 га лёну і 25 ц. саломы з 1 га канапель то атрымаем ільнянай саломы 420 т. тон і канаплянай 150 т. тон, а разам 570 тон. Гэта пры сярэднім выхадзе цэлюлёзы ў 60%(а па пададзеным Сібірскім камбінаце брал: 64 проц. цэлюлёзы ад перапрабленай колькасьці саломы) дасьць 342 тыс. тон цэлюлёзы. Гэта амаль у тры разы больш таго, што выпрацоўвае папяровы гігант СССР—Балахнінскі камбінат.

(А з лёну і канапель, засеяных у СССР у гэтым годзе можна атрымаць цэлюлёзы ў дзесяць разоў больш. Пры перапрацоўцы яе на паперу гэта колькасьць цэлюлёзы заменіць 221.000 га балянсавага лесу). Прычым неабходна адзначыць, што ва ўмовах нашай буйнай сацыялістычнай спэцыялізаванай гаспадаркі гэта вялізарная колькасьць кастрыцы будзе сконцэнтравана на невялікіх плошчах, што забясьпечвае значную эканомію па транспартных выдатках.

Калі нават кастрыцы хапіла-б у нас толькі на загрузку аднэй папяровай ф-кі, і то мэтаагодна было-б скарыстаць яе для вырабу паперы. У нас жа гэтай кастрыцы ужо ў 1932 г. хопіць для загрузкі добрых трох, а мо і больш папяровых фабрык, з якіх 2-3 могуць быць пабудаваны на тэрыторыі. б. Віцебшчыны і Полаччыны (ільняна-малочны раён) і 1-2 на тэрыторыі Палесься (канапляна-жывёлагадоўчы раён). Наогул жа кожныя 100 тыс. га пасёву лёну ці 50-60 т. га канапель дадуць сыравіну для адной папяровай фабрыкі тыпу Балахнінскага камбінату. А гэта тым больш абавязвае ўсе зацікаўленыя навукова-дасьледчыя і гаспадарчыя ўстановы БССР, ужыць ўсе сілы да тэрміновага вывучэньня і ажыцьцяўленьня названага пытаньня. Бо гэта адна з магчымасьцяй ажыцьцяўленьня індустрыялізацыі БССР, гэта адна з магчымасьцяй падвышэньня грамадзкай вытворчасьці працы, гэта сродак як мага хутчэй ператварыць СССР з краіны імпартуючай паперу ў краіну экспартуючую гэтую паперу за-межы.

А. Гарэвіцкі.

[1]) Ф. М. Ковар, Бум промышленность в пятилетке, ГИЗ, 1930 г., стар. 25.

[2]) Агроиндустриальные комбинаты Сибири. Масланинский агро-индустриальный комбинат, ч. II-я Н.-Сибирск, 1930 г., стар. 17, 71; 77.

Галаваціяпства Лёна-Канаплябуду ставіць пад пагрозу сваячасовы пуск Крупскага заводу

Крупскі лёназавод можна было-б закончыць патэрмінова, бо галоўны корпус адбудаваны на 78 проц., а шаха, склад, кантора і інш. будынкі—на 71 проц. Да 20-га верасьня завод павінен быць пушчаны. Аднак, справа пабудовы ў тэрмін аказалася пад пагрозай зрыву, бо Лёнаканаплявод не дасылае патрэбных струмантаў, а дасланыя крэйсмэйстры ў колькасьці 20 штук зьяўляюцца лішнімі, іх патрэбна ўсяго 2-3 штукі. Не дасланы да гэтага часу лёкамабіль, кудзельная машына, а галоўнае не дасылаецца трансьмісіі і шківы.

Праўда, чыгунныя шківы прысланы разам з швэйгурбінай, але яны не падыходзяць да канструкцыі будынку, а калі даслалі зноў драўляныя шківы—не падыйшлі.

Я. К.

Кадры, праграмы, падручнікі--сетцы партасьветы

Рашуча ўдарыць па спробах адкласьці партвучобу на „вольны час“

Бабруйскі райком яшчэ не разгарнуў падрыхтоўку да партвучобы

Летняя партыйная вучоба ва ўсёй партыйнай арганізацыі Бабруйскага раёну была сарвана. Ні на прадпрыемствах, ні ў вясковых калгасных і саўгасных ячэйках увесь летні час ніякія гурткі і школы не працавалі.

Зараз надыходзіць час зімовай партыйнай вучобы. Партыйная арганізацыя павінна была разгарнуць падрыхтоўчую работу, неабходна было разгарнуць растлумачальную работу на прадпрыемствах, распачаць вярбоўку ў школы, распрацаваць сетку партыйнай асьветы, падрыхтаваць кіраўнікоў і г. д. Але-ж уся падрыхтоўка да новага навучальнага году ў Бабруйскай партыйнай арганізацыі праходзіць надзвычайна павольнымі тэмпамі. Бюро райкому толькі 29-га жніўня мяркуе заслухаць даклад культпропу аб зімовай партыйнай вучобе. Толькі ў апошнія дні распачата распрацоўка сеткі. На прадпрыемствах, за выключэньнем камбінату, ніякай падрыхтоўчай работы не праведзена. Швэйная фабрыка, адно з буйнейшых прадпрыемстваў гораду, яшчэ і не распачала падрыхтоўчай работы да навучальнага году.

Ёсьць пагроза, што школы партыйнай асьветы застануцца без кіраўнікоў. Райком меў на ўвазе правесьці курсы па падрыхтоўцы прапагандыстаў. Было прапанавана ячэйкам вылучыць на курсы партыйцаў, але курсы так і не распачалі сваёй работы, бо... ніводная ячэйка прапановы райкому ня выканала і на курсы ніхто не зьявіўся.

Паданых фактаў дастаткова, каб зрабіць вывад, што ў Бабруйскай партыйнай арганізацыі яшчэ не пераключыліся на сапраўды бальшавіцкія тэмпы падрыхтоўкі да новага навучальнага году па лініі партыйнай асьветы. Зараз неабходна ўжыць самыя рашучыя меры па ўзмацненьні тэмпаў падрыхтоўкі. Уся партыйная арганізацыя павінна быць мабілізавана на разгортваньне падрыхтоўчай работы з тым, каб заняткі ў школах партыйнай асьветы былі-б пачаты свячасова і каб зімовая вучоба ня была сарвана.

Г-ў.

Разгарнулі падрыхтоўку да партвучобы

Ельск. (Наш кар.). Ельскі РК КП(б)Б ужо пачаў падрыхтоўчую работу да партасьветы.

З 15 верасьня у Ельску будуць працаваць кароткатэрміновыя курсы для падрыхтоўкі кіраўнікоў школ. Усяго будзе навучацца на гэтых курсах ня менш 55 асоб партыйнага і камсамольскага актыву. У раёне будзе арганізавана звыш 20-ці школ па партасьвеце, з ліку гэтых школ 2 школы павышанага тыпу па праграме саўпартшколы ў м. Ельску і ў м. Скародным.

Ельская школа павінна будзе ахапіць чыгуначных рабочых, камуны «Праца», саўгасу Леніна, і прылягаючыя да іх калгасы, а астатнія перша пачатковыя школы будуць адчынены пры буйных калгасах па наступных сельсаветах: Рамезаўскім, Мялешкаўскім, Санюкоўскім, Махнавіцкім, Р. Люксэмбургскім (нямецкім) сельсаветах.

Школамі будзе ахоплена звыш 200 чалавек членаў і кандыдатаў партыі і камсамольскага актыву звыш 100 чалавек, калгасьнікаў—каля 320 чалавек.

Акрамя тых кадраў, якія будуць падрыхтаваны на кароткатэрміновых курсах, культпроп мяркуе на месцы ў расьсы так і не распачалі сваёй работы, бо... ніводная ячэйка прапановы райкому ня выканала і на курсы ніхто не зьявіўся.

Паданых фактаў дастаткова, каб зрабіць вывад, што ў Бабруйскай партыйнай арганізацыі яшчэ не пераключыліся на сапраўды бальшавіцкія тэмпы падрыхтоўкі да новага навучальнага году па лініі партыйнай асьветы. Зараз неабходна ўжыць самыя рашучыя меры па ўзмацненьні тэмпаў падрыхтоўкі. Уся партыйная арганізацыя павінна быць мабілізавана на разгортваньне падрыхтоўчай работы з тым, каб заняткі ў школах партыйнай асьветы былі-б пачаты свячасова і каб зімовая вучоба ня была сарвана.

Г-ў.

Чакаем падручнікаў для партшкол

Чэрвеньская партарганізацыя пытаньню падрыхтоўкі да разгортваньня зімовай партвучобы надала баявы характар.

Створаная брыгада з райпартактыву ў ліку 10 асоб ужо практычна прыступіла да арганізацыі і камплектаваньня сеткі партасьветы з папярэдняй пастаноўкай пытаньня аб значэньні і неабходнасьці партвучобы на агульных сходах парт'ячэек з удзелам шырокіх мас рабочых прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і беднякоў і серадняковаў аднаасобнікаў.

Сетка партыйнай асьветы па Чэрвеньчыне (20 першапачатковых школ, 5—ВСПШ, 3—кандыдацкія школы, 2 гурткі бягучай палітыкі) будзе цалкам арганізавана і ўкамплектавана да 1-5 верасьня гг.

Поўнасьцю захоўваючы прынцып дабрахвотнасьці ў выбарах форм і відаў партвучобы, арганізацыя работы па ўкамплектаваньні школ праводзіцца пад лёзунгам 100-процантнага ахопу членаў і кандыдатаў партыі вучобай у сетцы партасьветы, з уцягненьнем ад 30 да 60 проц. беспартыйных слухачоў, ударнікаў рабочых і калгасьнікаў. Раённы партактыў будзе ахоплен сярэднімі і вышэйшымі зьвеньнямі сыстэмы завочных навучальных устаноў.

Для забясьпячэньня падрыхтаванымі прапагандыстамі школ партасьветы, з 15 верасьня пры РК пачынаюць працу месячныя курсы з лікам 20-25 чалавек. Падбор слухачоў на курсы прапагандыстаў ужо пачаты.

На сёньняшні дзень пач. вясковыя партшколы ў асноўным падручнікамі забясьпечаны. Чакаем падручнікаў для ВСПШ і праграм для ўсёй сеткі партасьветы. (Заказы дасланы свячасова). Аб падрыхтоўцы да зімовай партвучобы даны належныя падрабязныя паказаньні ўсім парт'ячэйкам з боку Бюро РК КП(б)Б. Нармальныя заняткі ў школах будуць пачаты 15 верасьня ў горадзе і 1 кастрычніка на вёсцы.

Пузакоў А.

Сваячасова забясьпечыць партсетку падручнікамі

Менскі Гарком КП(б)Б ужо разгарнуў шырокую падрыхтоўку да навучальнага году ў сэтцы партасьветы. Арганізаваны брыгады і пасланы на прадпрыемствы, саўгасы і калгасы, на дапамогу мясцовым партарганізацыям па наладжваньні партыйнай вучобы.

Пры доме Камасьветы арганізавана кансультацыя па пытаньнях арганізацыі партвучобы. Дому Камасьветы даны паказаньні падрыхтаваць да зімовай партвучобы партгабінэты на прадпрыемствах, а там, дзе іх няма, асабліва на буйных прадпрыемствах, арганізаваць новыя партгабінэты.

На прадпрыемствах гор. Менску ўжо разгорнута шырокая масавая работа. Праводзяцца спэцыяльныя вечары за партвучобу пад лёзунгам «за 100 проц. ахоп партыйцаў і камсамольцаў і рабочых прадпрыемстваў партыйнай вучобай».

Уся падрыхтоўчая работа па арганізацыі сеткі партвучобы павінна быць скончана да 1-га верасьня, школы павінны распачаць работу не пазьней 10-га верасьня.

На радзе прадпрыемстваў Менску школьная сетка ўжо арганізавана так:

На зав. «Бальшавік», арганізавана пяць першапачатковых партшкол на 100 чалавек, ВСПШ—на 75 чал., 2 зьменных ППШ—на 50 чал., школа актыву на 25 чал., 2 школы камсамольскай палітвучобы—на 50 чал., 2 палітгурткі для жанок рабочых.

Апроч гэтага, па лініі фабкому арганізуюцца дзьве групы для малапісьменных—на 40 чал., 1 група для няпісьменных—на 15 чал. і група па падрыхтоўцы на рабфак—на 20 чал.

На прадпрыемствах інваліднай кааперацыі арганізавана ППШ на 47 чалавек і ВСПШ 1 курс—21 чал.

Фабрыка «8-га сакавіка»: арганізавана 2 групы для кандыдатаў на 60 чал., 2 ППШ—на 50 чал., 1 група ППШ на яўрэйскай мове—на 30 чал., 1 група па падрыхтоўцы ў камсамол—на 30 чал. і 1 група камсамольскай вучобы—на 25 чалавек.

Чыгуначны вузел: арганізавана 7 груп ППШ на 230 чал., ВСПШ 1 курс, 4 групы—на 140 чал. і ВСПШ II курс—на 45 чалавек.

Дражджавы завод «Пралетары»: арганізавана ППШ—на 17 чал.

Аднак трэба адзначыць, што падрыхтоўка да навучальнага году на радзе прадпрыемстваў і ўстановаў гораду Менску да партыйнай вучобы разгорнута яшчэ недастаткова.

Белдзяржвыдавецтва не пазьней 1-га верасьня павінна выдаць на беларускай мове падручнік Кержанцава—«Памятка бальшавіка», Папова—«Гісторыя ўсеКП(б)», Сталіна—«Ленінізм», і па дыялекмату кніжку Вальфсона і Гака, але гэтыя падручнікі выпускаюцца вельмі марудным тэмпамі, што зьвяшчае перашкодай да свячасовага пачастку работы школ і гурткоў.

П. В.

„Няма часу займацца партвучобай“

Партасьвета як важнейшы сродак для падрыхтоўкі кадраў у Старасельскім сельсавеце недаацэньваецца. Партыйная ячэйка, якая маецца пры сельсавеце, ставіць пытаньне партвучобы на апошні плян.

Шмат партыйцаў гэтай ячэйкі зусім палітычна напісьменныя. Таму ня дзіва, што парт'ячэйкай былі дапушчаны і дапушчаюцца самыя грубыя памылкі як у галіне калектывізацыі, так і іншых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Сакратар гэтай ячэйкі т. Габрыеляў катэгарычна адмаўляецца ад правядзеньня партвыхаваўчай працы сярод партыйцаў, ён кажа: «Няма браток часу займацца гэтай справай». Калі хто жадае дапамагчы ў гэтай справе ячэйцы, дык сакратар і паасобныя партыйцы адмаўляюцца ад гэтага.

Патрэбна ўжыць належныя крокі для арганізацыі партыйнай вучобы ў

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Аб дзяржаўным забясьпечаньні сем'яў вайсковаслужачых, якія праходзяць тэрміновую службу ў кадрах Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі і службу ў пераменным складзе тэрытарыяльных часьцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі

У разьвіцьцё арт. 270 закону аб абавязковай вайсковай службе ад 13 жніўня 1930 г. (С. З. Саюзу ССР, 1930г. № 40, стар. 424) Цэнтральны выканаўчы камітэт і Савет народных камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

I.

1. Непрацаздольныя дзеці, браты, сёстры, жонкі і бацькі вайсковаслужачых радавога і малодшага начальніцкага складу, праходзячых тэрміновую (неперарыўную) службу ў кадрах рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і службу ў пераменным складзе тэрытарыяльных часьцей рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, маюць права на дзяржаўнае забясьпечаньне ў наступных выпадках:

а) калі ў рабоча-сялянскую Чырвоную армію прызваны адзіны працаздольны член сям'і пры адным ці больш непрацаздольных членах сям'і, якіх ён да прызыву ўтрымліваў сваёй працай;

б) калі, апроч прызванага ў рабоча-сялянскую Чырвоную армію, ёсьць другі працаздольны член сям'і і працай абодвых утрымлівалася тры ці больш непрацаздольных членаў сям'і.

Увага: Да сем'яў прызваных у рабоча-сялянскую Чырвоную армію прыроўніваюцца сем'і паступіўшых у рабоча-сялянскую Чырвоную армію ў добраахвотным парадку.

2. Да непрацаздольных членаў сям'і, маючых права на забясьпечаньне, адносяцца:

а) асобы маладзей 18 год;

б) мужчыны старэйшыя за 55 год і жанчыны старэйшыя 50 год;

в) інваліды першых трох груп інвалідносьці;

г) жанчыны на працягу апошніх 2 месяцаў да радоў;

д) жанчыны занятыя даглядам за недасягнуўшымі васьмігадовага ўзросту дзецьмі, братамі і сёстрамі вайсковаслужачага.

3. Калі ў сям'і вайсковаслужачага, якая да дню прызыву ня мела права на забясьпеч., адбудуцца зьмены (вынікаючыя з прызыву), зьмяняюцца права на забясьпечаньне, могуць зьмяшчацца ва ўстановы грамадзянскага выхаваньня, аховы здароўя і народнай асьветы на тыя-ж тэрміны, на працягу якіх выдаюцца дапамогі.

9. Парадак вучоты і прызначэньня забясьпечаньня ўстанаўляецца ўрадамі союзных рэспублік па пагадненьні з Народным камісарыятам па вайсковых і морскіх справах.

10. Сем'і вайсковаслужачых, якія дызэртавалі з радоў рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, пазбаўляюцца забясьпечаньня.

11. Асобы, якія маюць права на забясьпечаньне ў парадку сацыяльнага страхаваньня ці на падставе асобых законаў, не атрымліваюць забясьпечаньня ў парадку гэтай пастановы.

II.

12. З выданьнем гэтай пастановы ка суюцца:

а) пастанова ЦВК і СНК Саюзу ССР ад 4 верасьня 1929 г аб забясьпечаньні сем'яў вайсковаслужачых прызваных у кадры рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і ў пераменны склад тэрытарыяльных часьцей рабоча-сялянскай Чырвонай арміі (С. Саюзу ССР, 1929 г. № 57, стар. 530);

б) пастанова ЦВК і СНК Саюзу ССР ад 13 сьнежня 1930 г. аб парадку забясьпечаньня сем'яў вайсковаслужачых, прызваных у рады Чырвонай арміі і пераменны склад тэрытарыяльных часьцей рабоча-сялянскай Чырвонай арміі (С. З. Саюзу ССР, 1930 г. № 60, стар. 638).

Старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.

Нам. старшыні Савету народных камісараў Саюзу ССР
Я. РУДЗУТАК.

Сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэту Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль,
23 жніўня 1931г.
№ 14-692.

У бой за паперу!

Фабрыка „Спартак" — атэрацыйная сводка

Дата	Выпушч. прадукцыі ў тонах	Проц. вык. дзеннага пляну	Проц. прастою абставін.
22 жніўня . . .	34,361	85,85	22,91
23 „ . . .	19,792	57,01	31,83
25 „ . . .	28,455	78,12	18,75

Пастанова № 85 НК РСІ і НКЮ БССР ад 25 VIII 1931 году

У апошні час у сувязі з недахопам некаторых відаў дэфітыцных будаўн. матар'ялаў, паміж буд. арганізацыямі і інш. гаспадарчымі органамі наглядаюцца выпадкі абмену матар'ялу, атрыманага на будаўніцтва, чым парушаецца плянавасьць у снабжэньні будаўніцтваў і выкананьне плянаў будаўніцтва.

Улічваючы гэта Народны Камісарыят РСІ і НКЮ БССР пастанаўляюць:

1. Катэгарычна забараніць усім будаўнічым і гаспадарчым арганізацыям праводзіць абмен адных матар'ялаў, атрыманых на будаўніцтва, на другія, без дазволу і ведама плянуючых і забясьпечваючых органаў.

2. Папярэдзіць усе вышэйпамянёныя арганізацыі, што ў выпадку парушэньня гэтага, справы будуць разглядацца ў судовым парадку.

Нам. Наркома РСІ БССР Гурэвіч.
Нарком Юстыцыі Ляўкоў.

Забясьпечыць Данбас рабочай сілай

Данбасу патрэбны рабочыя рукі—шахцёры і рабочыя для будаўніцтва. Да 1-га кастрычніка павінна быць навербавана па СССР 78.000 рабочых. З гэтай колькасьці БССР павінна даць да 1-га кастрычніка—9.000 рабочых.

Аднак, на мясцох тармозяць вярбоўку, ставяць палкі ў колы гэтай важнейшай кампаніі.

З розных раёнаў БССР паступаюць паведамленьні аб абураючых адносінах да спраў вярбоўкі рабочай сілы з боку калгасаў. Ня лічачыся з яўна выказанай гатоўнасьцю многіх членаў калгасаў паехаць на капальні, ня лічачыся з тым, што сярод жадаючых ехаць многа старых, вопытных шахцёраў, прытым найбольш кваліфікаваных і дэфіцытных кваліфікацый, што зараз пасьля ўборкі ўраджаю ў калгасах і камунах многа вольных рук,—старшыні калгасаў і камун адмаўляюцца адпускаць іх, гэтым самым стараюцца сарваць вярбоўку рабочай сілы Данбасу.

У Клімавіцкім раёне вярбоўшчык Горлаўскага рудакіраўніцтва ня мае магчымасьці накіраваць у Данбас навербаваную групу калгасьнікаў ў 60 чал.

У Магілёўскім раёне вярбоўшчыкі Золата-Ташкоўскага рудакіраўніцтва ня маюць магчымасьці накіраваць у Данбас групу камунараў з камуны «Сталінск' заклік» (Вэндраскі сельсавет), бо гэтага ня хоча тав. Новікаў, старшыня камуны. Упэўнены, што «яго» камунары ня пойдуць у Данбас, ён дазволіў вярбоўшчыку склікаць сход (дазволіў і старшыня сельсавету). Але камунары—значная іх група—не апраўдваелі яго спадзяваньня: пасьля выступленьня вярбоўшчыка, пачалі запісвацца на работу ў Данбас. Тут не сьцярпеў т. Новікаў: «не паедзеце!»—крыкнуў ён запісаўшымся і дэманстратыўна пакінуў сход. А сьледам за тым абвясьціў запісаўшымся, што іх чакаюць «вынікі»: няўплата за працадні, высяленьне іх сем'яў і г. д.

Энэргічная работа т. Новікава, зразумела, дала вынікі: запісаўшыяся адмовіліся ехаць.

Такіх фактаў шмат.

Самае абураючае тое, што райвыканкомы, аддзелы працы, калгасаюзы ня толькі не абрываюць Новікавых, але вельмі часта пакрываюць іх.

Цэнтральныя органы БССР павінны прыняць тэрміновыя меры па забесьпячэньні вярбоўкі рабочай сілы ў Данбас; павінны заклікаць да парадку тых, хто пакрывае работу Новікавых і да іх падобных.

Краіна, народная гаспадарка чакаюць ад Данбасу вугля.

Данбас чакае ад Беларусі рабочых рук.

Каапэрацыя перашкаджае вярбоўцы рабочай сілы Данбасу

Зараз па Беларусі ідзе вярбоўка рабочай сілы для Данецкага камбіната-вугальнага басэйну.

З 7.000 рабочых, патрэбных Данбасу, на долю Беларусі прыпадае 9.000—калгасьнікаў, аднаасобнікаў і самасмольцаў. 70 проц. гэтай колькасьці, г. зн. больш 6.000 чал., павінна быць навербавана не пазьней 15 верасьня; астатняя колькасьць не пазьней 1-га кастрычніка. Але каб людзей накіраваць у Данбас, іх трэба на 3 дні забясьпечыць прадуктамі харчаваньня.

Беларускае прадстаўніцтва Данбасу (аб'яднаньне «Вугаль») па вярбоўцы рабочых на капальні атрымлівае з раёнаў БССР паведамленьні, аб цэлым радзе тормазаў у рабоце. Адным з гэтых тормазаў зьяўляецца каапэрацыя, якая адмаўляецца снабжаць завербаваных рабочых харчамі ў дарогу. Ніякія ўгаворы вярбоўшчыкаў і ўпаўнаважаных «Вугля», ніякія іх доказы, што каапэрацыя такімі сваімі адносінамі да адходнікаў зрывае справу снабжэньня Данбасу рабочай сілай—не дапамагае. Каапэратары не даюць ніводнага фунта хлеба адходнікам у Данбас.

Падамо факты:

24-га г. м. заг. разьмеркаваньнем харчоў Магілёўскага раённага ЦРК тав. Сахар даў катэгарычны загад па сыстэме разьмеркаваньня—не выдаваць прадуктаў адходнікам-гарнякам.

Няўжо-ж Белкаапсаюз і яго філіялы арганізацыі не ўсьвядомілі надзвычайнай вострасьці пытаньня вярбоўкі рабочай сілы Данбасу? Няўжо кіраўнікі Белкаапсаюзу запамяталі пастанову ЦВК і СНК СССР ад 30-га чэрвеня гг.

М.

Ніводнага мэтра драўніны не павінна застацца ня выгружаным

У загатоўках, вывазцы і выгрузцы лесу яшчэ няма бальшавіцкіх тэмпаў

Вывазка лесу пад пагрозай

Рашуча ўдарыць па дэмабілізацыйных настроях

На мясцох па загатоўцы і вывазцы дроў амаль ніякіх мер ня прымаецца. У сувязі з рэарганізацыяй лясной гаспадаркі, у мясцовых работнікаў зьявіліся дэмабілізацыйныя настроі, якія вельмі шкодзяць рабоце. Ідуць разважаньні: хто дзе будзе працаваць, каго куды перавядуць, а пра дровы, якія за квартал вывезена ўсяго 18 якіх за квартал вывезена ўсяго 18 рыць.

Дзелавое ці будаўнічае драўніны да сплаву падвезена ўсяго 62,3 проц. пляну, што ні ў якім выпадку ня можа задаволіць ні будаўніцтва, ні прамысловасьці. З-за невыкананьня плянаў лесазагатовак, вывазкі і сплаву лесазаводы будуць мець недагрузку, асабліва ў зімовы час, калі сплаўляць лес нельга будзе.

Ня гледзячы на гэта на мясцох не зварочваюць належнай увагі дровалесазагатоўкам.

Мясцовыя партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі яшчэ ня ўлічылі вялізарнага значэньня вывазкі дроў і лесаматэрыялаў і таксама не зварочваюць на іх належнай увагі.

У большасьці месц дзесятнікі ня маюць каляндарных расьпісаньняў і прамфінплянаў, яны ня ведаюць колькі яны павінны выканаць і перад кім яны адказваюць, бо Лесбел—далёка, а мясцовыя органы гэтым не займаюцца.

Раённыя партыйныя і прафарганізацыі павінны зараз-жа, неадкладна пераключыць сваю ўвагу на фарсыраваньне лесазагатовак, вывазкі і сплаў.

Трэба рашуча ўдарыць па дэмабілізацыйных настроях мясцовых работнікаў і прымусіць іх працаваць так, як гэта патрабуе трэці рашаючы год пяцігодкі.

Сацыялістычная прамысловасьць і рабочая кляса павінны быць забясьпечаны лесаматэрыяламі і дрывамі.

Гул—ц.

Зводка аб руху сплаву па БССР на 20 жніўня

Падвезена драўніны (будаўн. і дроў	61,2	проц. пляну
Пушчана ў сплаў	55,8	„ „
Прыбыла да канечных пунктаў . .	44,9	„ „

Ход сплаву па сплаўных канторах на 20 жніўня

Сплаўканторы	Падвез. драўніны у проц. да пляну	Пушчана ў сплаў: Проц. да пляну	Пушчана ў сплаў: Проц. да падвез.	Прыбыла да канеч. пункт. у проц. да пляну
Гомель	60,2	59,8	99,3	56,2
Бабруйск	58,2	51	87,6	44,2
Віцебск	63,7	68	98,8	56,3
Мозыр	66,8	56,9	85,2	26,2

Зводка аб ходзе лесазагатовак і лесавывазак па Лесбеле на 21 жніўня

Загатоўкі	Проц. выкан. гадов. пляну	Вывазкі	У проц. да гадов. пляну
Дзелавой драўніны .	76,6	Дзелавая драўніна .	57,4
Дровы	29,4	Дровы	42,2

Не дапусьціць памылак мін. году

Са зводкі атрыманай з месц на 20 жніўня 1931 г. відаць, што выгрузка лесу праходзіць вельмі дрэнна. На 20 жніўня выгружана ўсяго 503 тысячы кубамэтраў, альбо 19,2 проц. усяе сплаўленае для заводаў драўніны.

У мінулую зіму прышлося складаць надзвычайныя камісіі па выгрузцы лесу, пасылаць надзвычайных упаўнаважаных па выгрузцы вольхі на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у Мозыры. Ня лепш было тады і на лесапільным заводзе «Пралетары», дзе вадою зносіла калоды, якія прышлося вылоўліваць каля мастоў спэцыяльна ўстаноўленымі дзяжурнымі лодкамі.

Сёлета па ўсіх выгрузачных пунктах справа выгрузкі лесу стаіць таксама дрэнна, што пагражае забясьпячэньню заводаў сыравінай.

На справу выгрузкі лесу не зьвярнулі належнай ўвагі мясцовыя арганізацыі фабрык і заводаў. Яны не зразумелі, што ад свачасовай выгрузкі лесаматар'ялаў залежыць забясьпечаньне сыравінай прадпрыемстваў да будучай навігацыі.

Сукада.

ПА БССР

Надвор'е

Паводле даных доўгатэрміновага сэктару Бюро Надвор'я СССР, па 31 жніўня 31 г. чакаецца па Беларусі перавага няўстойлівага надвор'я з навальнічнымі ападкамі пры ўзмоцненым ветры.

Выехаў з СССР амэрыканскі інжынэр Купэр

Негарэлае. (Белта). 25-га жніўня выехаў за межы амэрыканскі інжынэр Купэр, які ў СССР знаходзіўся 2 месяцы.

Ад'яжджаючы, Купэр сказаў,—што за-адзін толькі год СССР мае вялізарныя дасягненьні. Пяцігодка бязумоўна будзе выканана, у гэтым я не сумняваўся раней і яшчэ раз пераканаўся цяпер, наведаўшы пабудоў. Будаўніцтва Днепрабуду, кансультантам якога я зьяўляюся, ідзе ўдарным тэмпамі. Якасьці работы, асабліва бэтону, надзвычайная добрая. Усе перашкоды на шляху будаўніцтва зьнішчаны і Днепрабуд — гэты сусьветны волат электраэнэргіі — будзе пушчаны ў тэрмін у маі месяцы 1932 году».

18,5 мільёнаў рублёў на капітальнае ўкладаньне

Менск, 27-VIII. (БелТА). Па намячэньню Дзяржпляну СССР для Беларусі намячаецца капіталаўкладаньне на 1932 год: па жыльлёвай гаспадарцы 7,5 мільёнаў рублей і на камунальную гаспадарку 11 мільёнаў рублей.

Новы сусьветны рэкорд па кладцы цэглы

Гомель. 27-VIII. (БелТА). На будаўніцтве ваенведу муляры браты Ігнат і Канстанцін Берліны, маючы ў помач сабе па двое чорнарабочых, пры спаборніцтве дасягнулі новага сусьветнага рэкорду па кладцы цэглы—ў паўгадзіны 1925 цаглін кожны.

У бой за торф

Узьняць вышэй тэмпы торфаздабычы

Зводка выкананьня пляну па торфаздабычы на торфазаводах БССР за 24 жніўня 1931 г.

Назва заводаў	Проц. выкананьня дзеннага пляну
Па ранейшаму наперадзе	
„Першага Мая" . . .	168,7
„Бальшавік" . . .	105,9
„Чырвоны Тарфянік" . .	77,3
„Новая Беларусь" . .	68,7
„Закрашынскі Мох" . .	60,9
Ня выходзяць з палосы ганебнага спарыву	
„Калектыўная Праца" . .	7,5
„Рэмізана" . . .	11,7
„Вольніца" . . .	13,3
„Смалявічы" . . .	15,0
„Шлях Сацыялізму" . .	16,4
„Чырвоны Сьцяг" . .	18,7
„Вялікі Мох" . . .	19,3
„Міханавічы" . . .	24,0
„Грэбянева" . . .	25,5
„Свабода" . . .	28,2
Імя Даўмана . . .	28,5
„Чырвоны Кастрычнік" .	33,7
„Асіпторф" . . .	37,8

Па ўсіх торфазаводах БССР сэзонны плян па зьвестках на 24 жніўня выканан на 47,7 проц., а дзённае заданьне—38,7 проц.

Па зьвестках Белторфаб'яднаньня на 25 жніўня торфазаводы БССР выканалі 26,4 проц. дзённага заданьня торфаздабычы і 48,4 сэзоннага пляну.



Гэтак падрыхтоўваць кадры нельга

Беларускі тарфяны інстытут накіраваў 20 студэнтаў 1-га курсу тэхналёгічнага аддзяленьня ў распараджэньне «Маскваторф», для пасылкі на вытворчую практыку тэрмінам на 2 месяцы. Як-жа скарыстоўваюцца і якую практыку адбываюць гэтыя студэнты? «Маскваторф» разаслаў студэнтаў па торфараспрацоўках па 2-3 чалавекі. Так, на торфараспрацоўкі «Вождь пролетариата» паслана 3 студэнты, якія працуюць па вымеры і вылічэньні кубатуры штабаляў, г. зн. выконваюць работу, якую можа выконваць звычайны пісьменны рабочы. А колькі было перапіскі Белторфінстытуту з Масквой за гэтыя месяцы! Нарэшце перапіска не дапамагла і ў Маскву паслалі прафэсара Бахцеева, які дабіўся прадастаўленьня месц. Паездка каштавала 100 руб., а вынікі..?

На Беларусі няма штабаляў?—можа запытаецце вы. Не, на Беларусі таксама разгорнуты торфараспрацоўкі і маюцца штабалі, але яны напэўна чакаюць і недачакаюцца маскоўскіх студэнтаў.

Паўстае пытаньне, няўжо студэнтаў нельга скарыстаць як належыць і даць належную вытворчую практыку ў БССР? Няўжо так разьвязваецца праблема кадраў, як гэта зрабіў Бел. тарфяны інстытут?

В. Гудкоў.

Егор'еўск, Маскоўскай вобл.
Торфараспрацоўкі «Вождь Пролетариата».

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР
Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева Кірмаш нявест
Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. вечар.

Дзяржцырк
Поўная перамена праграмы. Гастролі ўпоў прыбыўшых артыстых
Заслужоныя артысты ССРГ. Бр. ТАНЦІ музычныя сатырыкі
Лепшыя ў СССР атракцыёны, міравыя рэкорды плаваньня ў паветры 6 Эльворці 6
Вышэйшае дасягненьне эквілібрыстыкі 2 Голядзе 2
Новая групавая дрэсыроўка коняй А. В. Лапіада.
Выезд нэгрыцянскіх наезьнікаў жакеяў 4 Кук 4
Музычныя інструмэнталісты Вероніка | Выезд наезьніка Пэрвіль | Спарт. акрабаты Веомаш
Пачатак а 9 гадз. Льготныя білеты ў рабочай касе. Па заяўкам ФЗМК скідка 40 проц.

Кіно-тэатр Культура
Новы мастацкі бытавы фільм 2 МАТКІ 2 у галоўнай ролі Цэсарская

Кіно „Інтэрнацыянал"
З 23-га жніўня Паўночнае каханьне Звыш праграмы часопіс Бел. Дз. Кіно № 14
Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

Кіно „Пралетары"
Мастацкі фільм па нашум. раману ПРАКАЖЭНАЯ
Пачатак а 2, 3-45, Вач. а 7, 8-45 10-30 г.

„Чырвоная Зорка"
З 26-га жніўня Гарольд Лейд у новай амэрык. камэдыі „Шпаркасьць і націск" звыш прагр. „Трымай зладзея"
Цаны паніжаны.

СТУДЭНТЫ ЎСІХ КУРСАЎ
Беларускага Дзярж. Фінансава-Эканамічнага Інстытуту
ПАВІННЫ ЗЬЯВІЦЦА НА ЗАНЯТКІ
1-га верасьня 1931 г., а 8 гадз. раніцы
ДЫРЭКЦЫЯ

Таварыства Садзейнічаньня Рацыяналізацыі Вучоту (ОРУ)
АРГАНІЗУЕ КУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАХУНКАВОДАЎ
для ўстаноў і прадпрыемстваў г. Менску і для раёнаў
Слухачы раённай групы забясьпечваюцца стыпэндыяй 50 руб. у месяц (кватэрамі не забясьпечваюцца). Слухачы гарадзкой групы навучаюцца дармова. Тэрмін навучаньня ад 3 да 6 м-цаў
Заявы прымаюцца ў канцэляры ОРУ (Савецкая, 55, уваход з варот тэл. № 11-99) ад 10 да 12 гадз. дня да 5 верасьня.
Да заявы пасбходна дадаць наступныя дакуманты: 1) аб сацыяльным становішчы, 2) аб праве голасу, 3) аб узросьце (ня менш 17 гадоў) і аб адукацыі (ня ніжэй 5 груп)
Калгасьнікі павінны прадставіць згоду свайго праўленьня

Гэтым Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт і Вышэйшы Пэдагагічны Інстытут
АБВЯШЧАЮЦЬ УСІХ СТУДЭНТАЎ,
ШТО ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ
ЯК У БДУ, ТАК І ПЭДАГАГІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ
АДБУДЗЕЦЦА З 1-га ВЕРАСЬНЯ г. г.
а таму ўсе студэнты павінны быць да гэтага часу ў Менску
Студэнты, якія ня зьявяцца своечасова на заняткі, будуць выключаны з ліку студэнтаў.
Заняткі-ж са студэнтамі, якія будуць залічаны ў асобны прыём гэтага году, пачнуцца з 1-га кастрычніка.
Ч. в. п. Рэктара БДУ і Дырэктар Пэдінстытуту Рудніцкі

КНІГА ПОШТАЙ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ
КАМПЛЕКТУЕ для пачатковых школ, ФЗС, і ШКМ бібліятэчкі: па палітэхнізацыі, антырэлігійныя, вайсковыя і інш. паводле праграм ПКА.
ДЛЯ СЕТКІ ПАРТАСЬВЕТЫ: 6-кі масава-палітычнай, сел.-гасп. і іншай літаратуры паводле праграм Культпропу.
ВЫСЫЛАЕ кнігі па ўсіх галінах ведаў на расійскай, беларускай, яўрэйскай, польскай і інш. мовах.
Пры заказе звыш 10 рублёў і перасылцы грошай наперад перасылка за кошт „Кніга-Поштай"
ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА НА ПРАЦЯГУ 3-х ДЗЁН
Менскі філіял БДВ

У сувязі з новымі мэтодамі цэглавай кладкі
ПАТРАБУЕЦЦА
вялікая колькасьць некваліфікаваных рабочых
Жадаючыя АТРЫМАЦЬ РАБОТУ як мужчыны, так і жанчыны
МОГУЦЬ ЗЬВЯРНУЦЦА ПА АДРАСУ:
Менск, Кантора Будаб'яднаньня, Нова-Маскоўская вул., дом № 27 і Савецкая вул., пабудова Дома Ураду.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту 1 р.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
у Барысаўскі Пэдагагічны Тэхнікум і на аднагадовыя пэдкурсы пры ім
ПРАЦЯГНУТ ДА 10-га верасьня г.г.
Ёсьць вольныя месцы на II і III курсах Тэхнікуму.
Да 80 проц. студэнтаў будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам
Дырэкцыя

СКРЫГАЛАЎСКІ
Сельска-Гаспад. Тэхнікум
КАРМОВЫХ КУЛЬТУР
абвяшчае, што заявы аб прыёме ў Тэхнікум прымаюцца да 15 верасьня г. г.
Правілы прыёму абвешчаны ў газэце „Сав. Бел." за 19-VII і 25-VII г. г.
Адрас: м. Скрыгалава, Тэхнікуму.

ВЫДАНУЮ ДАВЕДКУ
Вайманам І. і Бэрнштэйнам гр-ну вёсні Міхалевічы, Шацкага сельсавету ГАНАРОВІЧУ
аб тым, што ён прымаў удзел у партызанскім атрадзе
ЛІЧЫЦЬ АНУЛЯВАНАЙ
Вайман, Бэрнштэйн.

Саюзны білет за № 15955 Саўгандальслужачых Полуяк Т., выд. Пятрыкоўскім райгрупкомам, квіт. 1004-п.
Асабовая вайсковая кніжка Ільяча К. А., выд. Расьнянскім ваенкаматам, квіт. 1005-п.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА